Мікола Бушко ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Вечная памяць ☞ 4

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 20 (2714) Год LIII | Беласток, 18 мая 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Кубак „Нівы”!

Пераможная каманда гімназістак з Кляшчэль

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

На календары 10 траўня, на гадзіннік 10^{10}, першыя каманды зышлі са спортпляцовак. Толькі што пачаліся элімінацыйныя матчы. Эмоцыі яшчэ не такія вялікія, удзельнікі ў першых матчах толькі што разагравацца. Трэнеры ўжо пачынаюць памалу непакоіцца, пасля кожнага выйгрышу — усмешка ды лёгкасць, разам з пройгрышам — недахоп і сум. На тварах дзяўчат, бо ж гэта турнір дзявочых каманд, усе настроі! Ад злосці праз жаль, канчаючы на эйфарыі.

Сяброўскія сцены Гімназіі № 3 у Бельску-Падляшскім 10 траўня сабралі большасць фанатаў валейбола, якія заадно гуляюць ды вывучаюць беларускую мову. Нагода для нас таксама незвычайная, бо менавіта там адбыліся „І гульні гімназій з дадатковым навучаннем беларускай мовы дзявочых каманд па валейболе пад ганаровым патранатам «Нівы»”. Пачатак турніру неафіцыйна пачаўся побач галоўнай залы, дзе яго галоўны арганізатар, настаўнік фізкультуры Юрка Чыквін увёў усіх трэнераў і суддзяў у правілы мерапрыемства. Пасля ўсе каманды прэзентаваліся прысутным у час адкрыцця турніру, прагучаў польскі нацыянальны гімн, а Марта Маліноўская, вучаніца мясцовай гімназіі, праспявала неафіцыйны гімн беларусаў Падляшша — „Люблю наш край старонку гэту”...

Васіль Ляшчынскі, дырэктар і заадно гаспадар мерапрыемства, падкрэсліў значэнне турніру і яго перспектывы, а менавіта працяг ідэі ў форме штогадовага валейбольнага турніру для школ, у якіх навучаецца беларуская мова.

— Калісьці арганізаваліся культурна-спартыўныя турніры беларускай моладзі, — кажа дырэктар Ляшчынскі, — зараз іх няма, а такая патрэба існуе.

Яўген Вапа, галоўны рэдактар „Нівы”, які гуляючы ў валейбол зламаў руку і двойчы нагу, таксама выказаў спадзяванне пераўтварыць гэтую сустрэчу ў міжнародны турнір, а таксама перакласці гэтую ідэю на іншыя віды спорту.

— Бельск мае спрыяльныя ўмовы, у Гайнаўцы вялікая зала, можна і ў Нарве, ці гэта будзе баскетбол, ці футбол, галоўнае, каб яднаць беларускія школы і іх вучняў.

Праўда, гэта не толькі нагода сустрэцца, але таксама прамоцыя спорту ды іншых праяваў беларускасці сярод моладзі. Ужо ў Бельску праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы па плаванню з удзелам каманд з Беларусі. Чаму тады не зрабіць чарговага кроку і вынесці беларускаць на іншы ўзровень?

Герояў спаборніцтваў таксама прывітаў старшыня Бацькоўскага камітэта бельскай гімназіі Віктар Нікалаюк. Камітэт, побач „Нівы”, таксама з’яўляецца спонсарам гульняў. Гэта паказвае, што і бацькам неабыякавая ідэя, якая ў пэўным сэнсе спалучае спорт з роднай культурай. Усё аднак не адбылося б, каб не энергія спадара Чыквіна. Шчыра кажучы, неаднойчы ўжо мне здавалася, што мае ён энергіі больш за сваіх вучняў. Увесь час імкнецца, каб яго вучні ў розных відах спорту былі самымі лепшымі, стварае ім магчымасці спаборнічаць, параўноўвацца, сустракацца пры розных нагодах. Турнір гэта чарговы доказ, што моладзь патрабуе такіх спатканняў, а іхні трэнер і настаўнік выходзіць насустрач гэтым патрэбам.

Суддзя турніру Яўген Бэдэнічук (злева) і арганізатар Юрка Чыквін

А вось героі суботняга турніру. Гаспадар, Гімназія № 3 з Бельска, выставіла дзве каманды, якія перайшлі ў паўфінал. Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы з Гайнаўкі таксама падтрымлівае добрыя традыцыі па валейболе ў сваёй школе. Яны таксама апынуліся ў паўфінале. Чацвёртай камандай у паўфінале была Гімназія з Кляшчэль, якая некаторым явілася прэтэндэнтам на перамогу. Магчымасці змагацца за першыя тры месцы не хапіла камандзе з Нарвы ды Гімназіі № 2 з Гайнаўкі і яны змагаліся за пятае месца. На сёмым месцы апынуліся вучаніцы з Гімназіі № 7 з Беластока. Вельмі эмацыянальны падыход часам адбіраў ім тэхніку, таму дзяўчатам не ставала дэтэрмінацыі, а затым і шчасця. Але ў будучыні ўсё ў іх руках! Сапраўдныя эмоцыі мелі толькі што прыйсці — дарога ў фінал. У даволі роўнай гульні пятае месца заваявала Гімназія № 2 з Гайнаўкі. Даволі сур’ёзны матч зайгралі каманды з Бельска. Гэта было не толькі змаганне за фінал, але і за прэстыж у школе — хто стане лепшым на гэты раз. Затое Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы з Гайнаўкі нядоўга супраціўлялася Кляшчэлям, а ў канцы прайграла і з другой камандай бельскай „тройкі” за трэцяе месца. У фінале Кляшчэлі зайгралі з першай камандай бельскай „тройкі”. Здаецца, гэта быў матч на самым высокім узроўні ў гэтым турніры, а вынік напэўна паказаў характэрную для спорту нечаканасць. Фаварыт — бельская „тройка” аддала першае месца „чорнаму каню” турніру — камандзе з Кляшчэль.

Кубкі атрымалі ўсе каманды, медалі ўзялі самыя лепшыя. А мы, думаю, пабачымся за год на II турніры.

XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы” і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб’яўляюць XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з’яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на прынтэры або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб’ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149** з прыпіскай на канверце: XII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **19 кастрычніка 2008 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб’яўлены ў лістападзе 2008 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі вартасныя ўзнагароды.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

Сакратарыят конкурсу:
Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 085 743 50 22.

Конкурс праводзіцца пры фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

9 770546 196000

Гуляй душа!

Першую дэкаду траўня ў Беларусі можна параўнаць толькі з пачаткам каляндарнага года — калядна-навагоднімі святамі. Жыццё ў гэты веснавы перыяд ідзе толькі ў адным кірунку — татальнага „расслабленія" рабочага класа, калгаснага сялянства і працоўнай інтэлігенцыі. Назіраецца суцэльнае „гуляй душа, гуляй, хоць тут зусім не рай". Не варта нават планаваць на гэты веснавы адрэзак часу сур'ёзных справаў, бо дзейнасць дзяржаўных устаноў фактычна паралізаваная. А ў кабінетах і калідорах выразна, як пісаў Бродскі, „пахне шыпрам з камсамолам". Нейкія з дзён першых двух тыдняў траўня ёсць працоўнымі, але пра гэта многія нават не здагадваюцца. І не дай вам Бог захварэць, бо вас ніхто не зразумее і нават не паспачувае. Так што шматлікім астролагам і прадказальнікам можна загадзя прадказваць нешта кшталту „перыяд неспрыяльны для планавання, працы і хваробы".

Пачынаецца ўсё з першамайскага дня салідарнасці працоўных усіх краін. Праўда, па іншых календарах гэта зусім не дзень, а Вальпургіева ноч, але галоўнае, што доўгае святкаванне пачынаецца. Ужо напярэдадні гарады і мястэчкі Беларусі густа аздабляюцца чырвона-зялёнымі барвамі. Прытым белы крамольны колер строга пад забаронай, хоць і ён віднее на цяперашнім дзяржаўным сцягу. Асабіста я ніяк не веру ў збядненне Рэспублікі Беларусь, пра якое цвердзяць эксперты-ворагі, бо колькасць тканіны, затрачанай на вулічныя сцягі, расцяжкі і кампазіцыі сапраўды ўражвае і яскрава сведчыць пра тое, што начальства не толькі мае грошы, але і не шкадуе іх для людзей.

1 траўня шырокія масы будаўнікоў светлага будучага, як і трыццаць гадоў таму, стройнымі калонамі рвуцца і мкнуцца на пляцы, каб прывітаць слугаў народу і падтрымаць правільны курс дзяржавы-карміцелькі. Так гарманічна гучыць у нас цяпер лозунг „Правильной дорогой идёте, товарищи!". Ну а слугі народа відавочна сталі бліжэй да людзей, злезлі з ранейшых высачэзных трыбун і аддзелены ад масаў толькі некалькімі шыхтамі міралюбівага АМАПу.

3 траўня — сусветны дзень свабоды друку. У Беларусі з гэтым усё даўно ў парадку. Гродзеншчына, прыкладам, паспяхова вызвалена ад свабоднага друку. Адна „Газета Слонімская" застаецца бяльмом на воку, але і тут управа знойдзецца. Нехта кемлівы слушна пастанавіў, што настала пара галоўнаму рэдактару паслужыць у „партызанах". Маўляў, хопіць ляпаць пальцамі па клавіятуры, хай паспрабуе лепш біць ботамі па пляцы. Заадно і псіхіятрычную экспертызу правесці, а то дзіўна гэта — ніхто не выдае газет, а ён, бачыш, цісне па-ранейшаму.

Галоўным жа ў пантэоне травеньскіх святаў з'яўляецца Дзень перамогі. Адзначаецца канец вайны з фашысцкай Нямеччынай у Беларусі і Расіі не 8 траўня, як у большасці іншых краін, а 9 траўня. Ну гэта заходнікі наблыталі. І таму, што саюзнікі ўжо адпачывалі, а савецкія войскі яшчэ суткі ваявалі. Ваююць яны і да гэтага часу, мяркуючы па вайсковых парадах бранятэхнікі. А беларусы ніколі не павінны забыцца, што іх слаўная гісторыя пачалася з 1941 года. Не было ні Грунвальда, ні Клецка, ні Оршы. Ні князя Вітаўта, ні Канстанціна Астрожскага, ні Булак-Балаховіча. А былі толькі „Лінія Сталіна", „песни партизан и алая заря", геаічны Смерш і ўсенародная прага хутчэй аддаць жыццё дзеля вялікай радзімы.

Праўда, ёсць яшчэ ў нашай краіне пласты маласвядомых грамадзян (няйначай нашчадкі Беларускай народнай самапомачы і Саюза беларускай моладзі). Вось на адным з інтэрнэт-апытанняў бальшыня рэспандэнтаў галоўным травеньскім святам для сябе чамусьці назвалі Радаўніцу, якая якраз прыпала на гэтую дэкаду. Але што такое памаліцца і ціха ўскласці кветкі на магілкі сваякоў і блізкіх у параўнанні з фанфарамі, ускладаннем вянкоў да танкаў і гарматаў і прыналежнасцю да вялікай дзяржавы, якая перамагла ўсіх і такім невысокім коштам — нейкіх дваццаць-трыццаць мільёнаў людзей.

Ну а вянчаў травеньскае святкаванне ў Беларусі дзень дзяржаўнай сімволікі. Гэта ўжо непасрэдна падарунак прэзідэнта ўдзячнаму народу. Так што „гуляй душа, гуляй!".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Добры і благі характар

Здавалася б, што некаторыя з'явы і прыналежныя ім паняцці — адвечныя, калі не вечныя, такія, як уява народа, а ў сувязі з гэтым народ, прыналежнасць да народа здаецца быць такой простай і відавочнай, што не патрабуе глыбейшага роздуму ці доказу. Тым часам у нашай частцы Еўропы народ, нацыянальная супольнасць з'яўляецца творам адносна маладым, паколькі развінутыя тэорыі народа як рэальнай супольнасці (але таксама і містычнай) выдумалі, выпрадукавалі нямецкія рамантыкі і гэта пад іх уплывам нацыянальная свядомасць апанавала розумы славянскай інтэлігенцыі. Апрача таго сучасны нацыяналізм, разам з яго схільнасцямі да нацыянальнай аўтаркіі, да вяшчэння нацыянальнага эгаізму і ўявы гісторыі свету як бязлітаснага змагання нацыянальных супольнасцей за ператрыванне ў варожым атачэнні — аж да ўявы таталітарнай, рэпрэсіўнай дзяржавы — гэта твор толькі канца XIX ст. А ствараласа гэта разам з развоем біялагічных навук, якія сталі адной з крыніц грамадскага дарвінізму. Перад з'яўленнем ідэі народа жывыя былі перш за ўсё родавая, племянная ці рэлігійная лучнасці, пашыраныя на наказ вернасці ўладарам і іх дружынам.

Маю перад сабою кнігу Мікалая Лоскага „Характар расійскага народа", выдадзеную — а гэта перавыданне замежнага выдання — у 2005 г. выдавецкай радай Рускай праваслаўнай царквы. Асоба Лоскага звярнула маю ўвагу, паколькі гэты выдатны расійскі філосаф і вучоны нарадзіўся ў ваколіцах беларускага Віцебска ў сям'і лесніка, хоць не дайшлі да мяне інфармацыі, каб Віцебшчына адыграла ў яго доўгай навуковай кар'еры нейкую значную ролю. Лоскі ў 1922 г. быў выдвараны з савецкай Расіі рашэннем Леніна разам з групай у пару соцень выдатных пісьменнікаў, мысляроў і вучоных, якія адважыліся выказаць крытычныя думкі наконт дактрыны бальшавізму. На шчасце (?) не дачакаліся яны ў Расіі эпохі росквіту панавання Сталіна, бо мабыць іх лёс не быў бы такі ласкавы, бо ў той час за крытыкаванне рэжыму расплачваліся галавою або шматгадовай ссылкай у лагер, у той „архіпелаг ГУЛАГ", як назваў яго Аляксандр Салжаніцын. Кніжачка Лоскага ўзнікла на схіле ягонай шматгадовай працы (мысляр памёр у эміграцыі ў ЗША) і мабыць таму імгліцца яна настальгіяй па беспаваротна страчанай радзіме.

Учытваючыся ў спробу вызначэння расійскага нацыянальнага характару, які прадставіў Лоскі, можна адчуць, што маем дачыненне да следапытнай працы, улоўлівання прывіду, ценю, ілюзіі. Расійскі характар, на думку аўтара, характарызуе і глыбокая рэлігійнасць (разам з камуністычнай рэлігійнасцю без Бога), дабрыня, але і схільнасць да насілля, нігілізму і звычайнага хуліганства. Месіянскія, эсхаталагічныя, глыбокія парывы, але і схільнасць да пасіўнасці, лянівасці, „абломаўшчыны" па Івану Ганчарову. Мабыць, гэта аднак цяжкасці, на якія натыкаецца кожны, хто намерваецца сцягнуць з неба няўлоўнасць, хмару, воблака дыму.

У апісанні нацыянальнага характару расіян Лоскі ўсё ж не з'яўляецца нацыяналістам, ксенафобам, як, напрыклад, некаторыя славянафілы ці еўраазіяты. Як жа ж перашкаджае ва ўспрыманні важных гістарычных твораў еўраазіята Льва Гумілёва хоць бы маніфеставаны антысемітызм. Паводле еўраазіятаў завяванне рускіх зямель у змроку Сярэднявечча манголамі прынесла дабрадзейны вынік, паколькі захавала іх ад заходніх уплываў, а Захад, як абвяшчаюць еўраазіяты, гэта гнілы лібералізм, марная дэмакратыя і бязбожны індывідуалізм. Не мушу дадаваць, што беларускія землі ніколі не трапілі пад мангольскае ярмо, што іх вылучае сярод славянскіх зямель.

Мабыць тое, што Лоскі акцэнтуе як арыгінальныя рысы нацыянальнага характару расіян, маглі б прыняць прадстаўнікі шмат якіх народаў свету, неабавязкова толькі славянскіх, калі не большасць народаў свету.

Не сутыкнуўся я з паглыбленай спробай вызначэння нацыянальнага характару беларусаў, мабыць, было б гэта донкішоцтва, парыў на змаганне з ветракамі; не ведаю таксама сур'ёзнай дыскусіі на тэму рысаў

(працяг на 8 старонцы)

Вачыма еўрапейца

Клопат аб беларускі інтарэс

Калі на Крамлі ў Маскве прымалі прысягу ад новага прэм'ер-міністра Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева, у польскім Сейме працягвалася дэбата на тэму замежнай палітыкі РП у 2008 г. Шэф МЗС Радаслаў Сікорскі і дэпутаты кранулі таксама пытанні адносін з Беларуссю, хоць у кантэксце матыву, датычнага да ўсходняй палітыкі нашай краіны, былі яны больш пабочныя чым праблемы сувязей з Расіяй ці Украінай. Паколькі якраз у гэты дзень хтосьці запланаваў кансервацыю перадатчыкаў публічных радыё і тэлебачання, зацікаўленыя польскай замежнай палітыкай у Беластоку не мелі шанцаў выслухаць выступлення міністра Сікорскага і значнай часткі дэбаты. Так вось сёння дазволю сабе прывесці некалькі фрагментаў сеймавых дыскусій. Радаслаў Сікорскі пераконваў:

— Я прагну тут звярнуцца да нашых беларускіх суседзяў і гарантаваць ім, што Беларусь можа разлічваць на польскую падтрымку ўсюды там, дзе паставіць на ўшанаванне правоў чалавека і палітычных правоў апазіцыі, на дыялог і кампраміс ды на адкрытасць да Еўропы. Будзем гатовы, падобна як увесь Еўрасаюз, даць Беларусі дапамогу ў яе развіцці. Гэта таксама пастулаты і інтарэс беларускага незалежніцкага і дэмакратычнага лагера ды польскай меншасці ў гэтай краіне.

Тут стаў я разважаць над гэтым, што ў дыпламатычна-палітычнай мове мае значыць слова „нармальных". Не дайшоў я да вываду да гэтай пары. За спробу крытыкі планаванай на гэты год замежнай палітыкі ўзялося ПіС. Дэпутат ад гэтага клуба Павел Коваль гарантыі Радаслава Сікорскага назваў „непаслядоўнымі і даводзячымі да здзіўлення":

— Для высокіх беларускіх чыноўнікаў ужо ад нейкага часу адкрыліся — наперакор еўрасаюзным рэстрыкцыям — міністэрскія кабінеты ў Варшаве. Гэта тлумачыцца ветліва як быццам бы рэалізм, рэкамендуецца як аўкцыённая карта ў чарговых размовах і сустрэчах.

Міністр Сікорскі бараніўся:

— Спадар дэпутат Коваль папракае ўрад у непаслядоўнай палітыцы ў адносінах да Беларусі, быццам бы сустрэчы з беларускімі ўладамі былі нейкай здрадай інтарэсаў беларускай апазіцыі. Спадар дэпутат, пан прэм'ер Дональд Туск сустракаўся і з панам Мілінкевічам, і з пані Борыс, я з імі сустракаюся і яны нас да гэтага намаўляюць.

Падляшскі дэпутатат Грамадзянскай платформы, шэф парламенцкай групы па справах Беларусі Роберт Тышкевіч паказаў сапраўды дыпламатычную рыторыку:

— Мы ўрэшце ў такой сітуацыі, у якой польская ўсходняя палітыка апрача прынцыповага вербалізму пачынае сапраўды здабываць прылады для дзеянняў і магчымасці ўплывання на развіццё сітуацыі на ўсход ад нас.

Пры нагодзе раскрыў, што на спіску ўсходняй польскай замежнай дапамогі апынулася таксама Беларусь і ўрад (толькі каторы і на які перыяд?) на гэтую мэту дастаў 27 мільёнаў злотых, з агульнай пулькі на падтрымку дэмакратычных перамен на ўсход ад Польшчы агулам у 110 млн. злотых:

— За гэтыя грошы рэалізуюцца такія прэстыжныя мерапрыемствы як тэлебачанне БелСат, Радыё Рацыя, стыпендыяцкія праграмы для студэнтаў, але і выкарыстоўваюцца яны як падмацаванне развіцця сельскіх абшараў ці самакіравання.

Ужо бачу, як пералічаныя дэпутатам Тышкевічам бенефіцыенты такіх „вялікіх" грошай з захапленнем ускліквaюць: Hulaj dusza!

— Гэта дадаванне каровы да каня, — пракаментавала гэты фрагмент выказвання дэпутата Тышкевіча дырэктар тэлеканала БелСат Агнешка Рамашэўская.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2008”

Так трэба і так можна

Размова з дырэктарам Фестывалю Міколам Бушко

— Яшчэ ў мінулым годзе, калі мы гутарылі пра сёлетні Міжнародны фестываль царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2008”, я спытала пра самую вялікую неспадзяванку, якой можам чакаць. Помніце, што Вы адказалі?

— Натуральна, што помню. Я сказаў, што самай вялікай неспадзяванкай будзе факт калі фестываль адбудзецца.

— Памяць у Вас выдатная. А я цешуся, што чарговы раз магу зазірнуць у праграму фестывалю са свядомасцю, што Фонд „Царкоўная музыка” паміж 20 а 25 траўня рыхтуе любіцелям музыкі сапраўды духовую страву...

— Так, гэта праўда, страву духовую ды мастацкую, таму што заўсёды стараемся спалучаць гэтыя плыні. Я перакананы, што за дваццаць шэсць гадоў мы даказалі, што так трэба і так можна. Гавару пра гэта таму, што ў мінулым прыходзілася нам дыскутаваць з тэзісам, што ў царкоўнай музыцы галоўная духоўнасць. Я заўсёды дадаваў, што гэта праўда, але нядрэнна было б спалучыць духоўнасць з мастацтвам.

— Ці гэта абазначае, што арганізацыйна Вы разабраліся з усімі праблемамі ці, мабыць, мусілі пакінуць нейкія ідэі?

— Некаторыя ідэі сапраўды мы мусілі можа не адкінуць, а толькі адтэрмінаваць.

— Бачу, што не памянялася ідэя інаўгурацыйнага канцэрта?

— Сапраўды, ад часу, калі ў мерытарычнай частцы фестывалю мы маем абсалютную свабоду, мы рашылі прэзентаваць усе жанры царкоўнай музыкі. Аказваецца, у царкоўнай музыцы, прынятай цэрквамі, знаходзім многа твораў, якія па вядомых ці невядомых прычынах не выконваюцца, або выконваюцца вельмі рэдка. Думаю, што адной з галоўных прычын такой сітуацыі з'яўляецца аграмадная праца, неабходная для выканання такіх кампазіцый. Паколькі мы ўжо да гэтага прывыклі, стараемся з гэтым справіцца. Якраз сёлетні інаўгурацыйны канцэрт спалучае цудоўную ідэю прэзентацыі даволі рэдка выконваных твораў: царкоўнай класікі (Архангельскі) з сучаснасцю (Пэндэрэцкі).

— Чаго ў гэтым годзе можам спадзявацца па конкурснай частцы?

— Гэта будзе свет царкоўнай музыкі. У кожным сэнсе: мерытарычным, геаграфічным, выканаўчым. Спадзяемся хораў з чатырнаццаці краін Еўропы, Амерыкі, Азіі. Спяваць будуць праваслаўныя, каталікі, грэка-католікі, стараверы, пратэстанты, хоры дзіцячыя, жаночыя, мужчынскія ды мешаныя, самадзейнікі і прафесіяналы, хаця тут такая тонкая мяжа, якая часам перасоўваецца то ў адзін, то ў другі бок. Карацей, гэта значыць, што часам аматары спяваюць не горш прафесіяналаў. Не забываем, што нашай галоўнай мэтай і місіяй з'яўляецца папулярызацыя царкоўнай музыкі ў неправаслаўных асяроддзях і таму ў гэтым годзе паявяцца хоры з асяроддзяў, у якіх царкоўную музыку трэба яшчэ папулярызаваць.

— Што новага ў культурнае жыццё Беластока і Падляшша, а нават Польшчы ўнясе сёлетні фестываль?

— Думаю, што мерапрыемства пакіне свой след у культурным жыцці Польшчы. Беласток, Белавежа, Варшава, Кракаў — гэта месцы, дзе адбудуцца канцэрты, але і іншыя гарады — Вроцлаў, Пярэмышль, Ольштын, Кельцы — адкуль прыедуць хоры. След гэта не толькі тое, што адбудзецца між 20 а 25 траўня. Фестываль гэта таксама тое, што застанецца пазней: музычныя выданні, нотная бібліятэка, перадачы ў сродках масавай інфармацыі, выстаўкі, артыкулы ў прэсе. Гэта таксама тое, на што спадзяемся ў выніку супрацоўніцтва з Польскім саюзам хароў у час фестывалю.

— У праграме зноўку бачу агромную разнароднасць культурных падыходаў да музыкі, яе выканання, шмат нацый.

— Пра разнастайнасць гаварылі мы ўжо крыху раней, аднак нягледзячы на гэта варта звярнуць увагу на нацыянальнасці. Апрача хароў з Польшчы чакаем амерыканцаў, армян (з Арменіі ды Ірана), літоўцаў, латышоў, малдаван, расіян, славакаў, беларусаў, чэхаў, эстонцаў, грузінаў ды ўкраінцаў. Хачу нагадаць, што асноўнай ідэяй Рады Еўропы ў гэтым годзе з'яўляецца „Еўрапейскі год культурнага дыялогу”. Гэтую ідэю фестываль здзяйсняе з самага пачатку, значыць з 1982 года. Еўрапейскі лозунг супадае з нашай дзейнасцю.

— Гады бягуць, фестываль з 2003 года адбываецца ў Беластоку. Але канфлікт, з прычыны якога фестываль пакінуў сцены сабора Святой Тройцы ў Гайнаўцы, зноўку адбіваецца рэхам, а нават вяртаецца са здвоенай сілай. Я бачыла Ваш жорсткі адказ на інтэрв'ю з айцом Негрэвічам, змешчаным у „Гайнаўскім кур'еры”.

— Не трэба гэтага лічыць за канфлікт. Сутнасць канфлікту заключаецца ў тым, што ў яго два бакі, а мы не маем ахвоты ўваходзіць у сваркі са стваральнікамі мерапрыемства, якое з'яўляецца плагіятам і копіяй нашага фестывалю. Няўдалай копіяй. Адно, што хвалюе, гэта вялікая колькасць выказванай няпраўды. Няпраўды — і гэта больш баліць — выказанай духоўнай асобай. Мяне асабіста і многіх людзей звязаных з фестывалем (як вернікаў Праваслаўнай царквы) баляць таксама абвінавачванні ў антыцаркоўнай і антыправаслаўнай дзейнасці, выказаныя айцом Негрэвічам.

— Чаму гэта Вас так усхвалавала? Вы ж, здаецца, свядомы вартасці сваёй працы ды яе эфектаў?

— Так, мы свядомы гэтага, але наш абавязак — абараняць перад хлуснёй ідэю адзінага ў свеце такога мерапрыемства і людзей, дзесяткамі гадоў звязаных з ім. Такія абвінавачанні і паклёпы пацвярджаюць, што іх аўтар несвядомы аграмаднай працы, якую ўкладалі і надалей укладваюць сотні людзей, і крыўды, якую ім учыняе. З гэтым мы ніколі не змірымся.

— Гэта будзе дваццаць шостая эдыцыя фестывалю. На што багацейшы чалавек за столькі гадоў працы?

— Гэтыя гады паказалі, што ў такой малой мясціне як Гайнаўка можна прыдумаць і рэалізаваць важныя ідэі. Ідэі, якія вышэй за межы — сапраўдныя і сімвалічныя. Гэта сустрэчы з сотнямі, а нават тысячамі цудоўных людзей, свецкіх і духоўных, амаль з усяго свету, і магчымасць супрацоўнічаць з імі. Гэта радасці, турботы і вялікі вопыт, прыемнасць пазнаваць музычную і духоўную культуру праваслаўнага свету. Думаю, што гэта самае вялікае багацце.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

Фота Мірыл ЛУКШЫ

PROGRAM XXVII MFMC — „HAJNÓWKA 2008”
Opera i Filharmonia Podlaska, Białystok, ul. Podleśna 2

INAUGURACJA FESTIWALU
2008.05.20 (wtorek), godz. 18.00
Otwarcie Festiwalu

Chór Opery i Filharmonii Podlaskiej pod dyr. prof. Violetty Bieleckiej

Chór „Vilnius” z Wilna (Litwa) pod dyr. prof. Povilasa Gylisa

Koncert Inauguracyjny

Krzysztof Penderecki — „Pieśń Cherubinów”

Aleksander Archangielski — „Całonocne czuwanie”

Koncert w wykonaniu:

Chóru „Vilnius” z Wilna (Litwa) pod dyr. prof. Povilasa Gylisa

22 maja 2008 r., godz. 20.00,
Sala Kameralna Filharmonii Podlaskiej

Projekcja Filmów o Festiwalu m.in. „Jutrznia” K. Pendereckiego w Sankt Petersburgu

PRZESŁUCHANIA KONKURSOWE
2008.05.22 (czwartek), godz. 17.00

Dziecięcy Chór „Otrokowicy” — Kolkia (Estonia)

Zespół Cerkwi pw. Wniebowstąpienia — Gervais (USA)

Żeński Chór „Elegia” — Łobnia (Rosja)

Zespół „Vox Cantabilis” — Jirkov (Czechy)

Żeński Chór „Namysto” — Przemyśl (Polska)

Akademicki Chór Politechniki Świętokrzyskiej — Kielce (Polska)

Kameralny Chór Akademii Medycznej — Wrocław (Polska)

Mieszany Chór — Ryga (Łotwa)

Męski Chór „Świętego Romana Słodkopiewcy” — Preszow (Słowacja)

2008.05.23 (piątek), godz. 15.00

Dziecięcy Chór „Komitas” Cerkwi pw. Wszystkich Świętych — Isfahan (Iran)

Zespół Śpiewaków Cerkiewnych — Moskwa (Rosja)

Chór Mieszany — Kiszyniów (Mołdawia)

Męski Zespół — Tbilisi (Gruzja)

Dziecięcy Chór „Lira” — Mińsk (Białoruś)

Mieszany Chór „Zemgale” — Jełgawa (Łotwa)

Męski Chór Uniwersytetu — Witebsk (Białoruś)

Studencki Chór Uniwersytetu — Charków (Ukraina)

2008.05.24 (sobota), godz. 17.00

Żeński Zespół Chóralny „Saratowska Polonia” — Saratów (Rosja)

Akademicki Chór „Mozaika” — Mohylew (Białoruś)

Akademicki Chór „Bel Canto” — Olsztyn (Polska)

Wokalny Zespół Kameralny „Canzona” — Warszawa (Polska)

Chór Telewizji Ormiańskiej „Avedis” — Erewań (Armenia)

Lipiecki Chór Kameralny — Lipieck (Rosja)

Galicyjski Chór Kameralny — Lwów (Ukraina)

Chór Radia i Telewizji Mołdawii „Mołdowa”- Kiszyniów (Mołdawia)

2008.05.25 (niedziela)

godz. 14.30 — Ogłoszenie Werdyktu Jury i wręczenie nagród

godz. 16.00 — Koncert Galowy

Гайнаўка

Музей кавальскага рамяства запрашае

Музей кавальскага і слесарскага рамяства ў Гайнаўцы па вул. Ліпавай, 1, запрашае агледзець выставу прылад ды кавальскіх і слесарскіх вырабаў, ад аўторка дла суботы ад 9 да 18 гадзіны, а ў нядзелі ад 10 да 18 гадзіны. Паказы-дэманстрацыі кавальскага рамяства ў кузні адбываюцца толькі пасля ўзгаднення па тэлефоне (085)6822564.

Мала дошак аб'яў!

У Гайнаўцы мала дошак аб'яў. Няма іх на аўтобусным і чыгуначным вакзале. Некалі быў тут барак, а ў ім касы ды пачакальня. Але былі тумбы з афішамі і плакатамі. Былі дошкі аб'яў у пасёлку Фабрыка Хімічная — там перад крамай „Сполэм" па вул. Беластоцкай. Але зараз — няма!

Няма іх на ўскраінах горада, у тым ліку ў пасёлку Юдзянка, на скрыжаванні вуліц Пілсудскага і Белавежскай і ў канцы вул. Ліпавай. Жыхары на ўскраіне хацелі б ведаць пра культурныя і спартыўныя мерапрыемствы, якія ладзяць Гайнаўскі дом культуры, Музей і Асяродак беларускай культуры ды асяродак спорту і адпачынку, апрача таго — якія кінафільмы дэманструюцца ў кіно. На перыферыях горада не вядома калі адбываюцца сесіі Гарадской рады або рады Гайнаўскага павета. Сюды не трапляюць паведамленні дзяржаўных і мясцовых устаноў. А шкада! Жыццё бурліць толькі ў цэнтры горада.

Таму дзіўным мне здаўся адказ бурмістра Гайнаўкі, што дошак аб'яў у горадзе дастаткова! Пра хаця б адну дошку аб'яў прасіла ў час сесіі Гарадской рады радная з пасёлка Юдзянка.

Руйнуюць дашкі!

Перад поўднем 28 красавіка г.г. быў я на чыгуначным і аўтобусным вакзале ў Гайнаўцы. І прыкра было мне глянуць на разбітую сценку з моцнага шкла павеці-дашка на аўтобуснай стаянцы н-р 1. На брусчатцы ляжала гурба шкла са сценкі ды з разбітых бутэлек з цёмнага шкла. Ніхто гэтага яшчэ не прыбраў. Варта дадаць, што раней на стаянцы н-р 2 пабілі вялікія шыбы з дзвюх бакавых сценак.

Чаму дзе як дзе, але тут на вакзале няма маніторынгу — ні адной камеры? Мабыць таму тут хуліганнё адчувае сябе бяскарна!

(ян)

Калі заплаціць?

Атрымаў я 7 красавіка 2008 года ад Паслугова-гандлёвага гарадскога прадпрыемства ачышчання ў Беластоку фактуру за вываз смецця з майго панадворка. Фактура надрукавана 21 сакавіка 2008 г., тэрмін аплаты — 31 сакавіка 2008 г. Паколькі я атрымаў ліст з фактурай тыдзень пазней, мушу плаціць адсоткі таму, што плачу пасля вызначанага чысла. Стаўлю пытанне: ці я, заплаціўшы кару, магу парваць дагавор з імі на адбор смецця з майго панадворка?

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Саколка: вечная памяць

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

На могільніку савецкіх салдат у Саколцы (злева): сакольскі староста Францішак Будроўскі, сакольскі віцэ-прэзідэнт Пётр Буйвіцкі, генконсул РБ Міхал Аляксейчык паміж гродзенскімі саратнікамі

Гэта было не толькі пасвячэнне крыжа, але і пасвячэнне дружбы паміж нашымі народамі, — сказаў адзін з саратнікаў, якія прыехалі з Гродна на ўрачыстасці ў гонар савецкіх салдат, якія загінулі ў час II сусветнай вайны на Сакольскай зямлі. Госцям з Беларусі ў час ваеннай завірухі было па 17 гадоў. На могільніку савецкіх жаўнераў у Саколцы пахаваны 1 572 салдат.

— Тут знаходзяцца магілы вядомых жаўнераў і магіла невядомага. Згодна інфармацыі на табліцы перад могільнікам, пахаваны тут салдаты, што загінулі ў 1941-1944 гадах, — сказаў „Ніве" намеснік бурмістра горада Саколкі Пётр Буйвіцкі.

Урачытасці 10 мая пачаліся зранку ў цэнтры горада багаслужбай у царкве Аляксандра Неўскага, якую адслужыў а. Уладзімір Місяюк. Пасля адправіў ён паніхіду на могільніку, пасвяціў крыж, пастаўлены тут па яго ініцыятыве і дзякуючы старанням (пры падтрымцы прыватнага спонсара) генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Беластоку Міхала Аляксейчыка, а ўстаноўлены пры дапамозе сакольскіх гарадскіх улад. Як адзначыў а. Місяюк, на сакольскую некраполію крыж прывёз консул асабіста:

— Уласнаручна выгружаў яго з машыны.

Раней у царкве, пасля завяршэння багаслужбы, духоўны гаварыў:

— Да гэтай пары прыходзілі мы на гэтае месца, на гэты могільнік памаліцца, але не было тут якогась відочнага знаку, пад якім можна было якраз спыніцца і памаліцца, бо помнік [у чырвоным колеры самавіты манумент завершаны сярпом ды молатам — М. Х.], які стаіць вось там, не з'яўляецца такім знакам.

Як дадаў, лозунгам да гэтага дня маглі б быць словы Евагнгелля аб тым, што для вечнага жыцця патрэбны іншы хлеб, чым той, які неабходны для таго, каб пражыло зямное цела — малітва:

— Гэтыя людзі, якія склалі тут свае зямныя астанкі, не раз не хацелі ісці на вайну. Узятыя ў армію, не заўжды ўмелі паводзіць сябе на вайне. І яны найчасцей аддавалі сваё жыццё. А ці гэта было слушным, ці не, — не наша справа меркаваць аб гэтым.

На могільніку, спасылаючыся на трагічныя ваенныя лёсы, айцец Уладзімір таксама адзначыў:

— Калі глядзім на некаторыя справы выключна праз прызму вялікай палітыкі, некаторыя з іх нам блытаюцца.

Сярод палеглых на сакольскім могільніку спачывае брат пакойнага а. дэкана Антонія Дзевятоўскага з Гайнаўкі.

— Ніхто апрача яго не наведаў, — успамінаў а. Уладзімір Місяюк. — Мы да гэтага часу прыходзілі сюды раз у год — на Усекнавенне Галавы Іаана Хрысціцеля. Цяпер, калі стаіць тут крыж, будзем мець нагоду часцей заходзіць сюды на малітву, пры ўрачыстасцях памінання памерлых, пры пасхальных ці асенніх напамінках.

Да гэтай пары прыходзілі мы на гэтае месца, на гэты могільнік памаліцца, але не было тут якогась відочнага знаку, пад якім можна было якраз спыніцца і памаліцца — сказаў а. Уладзімір Місяюк.

Па запрашэнню консула Міхала Аляксейчыка на ўрачыстасць у Саколку прыехала трое адстаўных салдат з Гродна. Іх барты былі поўныя ордэнаў і адзнак.

— Мы тут, каб аддаць пашану палеглым у час вайны, заадно рускім, беларускім і польскім салдатам. Я служыў у вайсках аховы пагранічча і тут яны якраз, на Сакольшчыне, першыя ўзяліся за барацьбу з Нямеччынай. Тут прагучалі першыя выстралы, так у 1941, як і ў 1944 годзе, — расказваў „Ніве" палкоўнік Грыгорый Абеленскі.

— У механізаваным корпусе ў час вайны прайшоў я ўсю Польшчу. Фрасіраваў Нарву, Віслу, Одэр. Найцяжэйшае ў час вайны — хаваць сваіх сяброў, — успамінаў адстаўны маёр Яўген Чабурэвіч.

Падпалоўнк Іван Брытаў:

— Пасля заканчэння Школы ваеннай пяхоты ў 1944 г. адправілі мяне на III Беларускі фронт. Я ваяваў на Беларусі і ва Усходняй Прусіі, быў двойчы паранены. Пасля вайны ў Гродне працаваў я выкладчыкам гісторыі ў Вышэйшай медыцынскай акадэміі.

Дзень да ўрачыстацей у Саколцы ў Беластоку на Гарадскім могільніку ўшаноўвалася памяць палеглых салдат, таксама і беларусаў, якія больш чым паўвека таму служылі ў Чырвонай Арміі. Тым часам паралельна з царкоўна-могільнікавымі ўрачыстасцямі ў Саколцы пад кінатэатрам у цэнтры горада працягваўся народны фэст. У адным з латкоў за 150 злотых можна было купіць амаль паўметровую латуневую статуйку Адольфа Гітлера ў мундзіры. Прадавец сярэдняга ўзросту не бачыў у гэтым нічога неадпаведнага ды і нікога з прахожых, якіх мы сустрэлі, гэта нічуць не здзівіла.

Чарнянскія добраахвотнікі

Віталь ЛУБА

Летась пажарнікі-дабравольцы з вёскі Чорная-Вялікая Сямятыцкага павета адзначалі 50-гадовы юбілей. З гэтай нагоды адбыліся павятовыя святкаванні прымеркаваныя да Дня пажарніка. Калі год таму запытаў я пажарнікаў-сеніёраў пра пачаткі пажарнай справы, аказалася, што сягаюць яны другой паловы саракавых гадоў і на добрую справу можна гаварыць аб 60-годзі мясцовай каманды.

— Першапачаткова маладых кандыдатаў у пажарнікі абучаў Пятро Кісель, даваенны падафіцэр Войска Польскага, — успамінае Уладзімір Луба. — Ён збіраў нас, выстройваў у шарэнгі і праводзіў заняткі па муштры. Маршыравалі мы за вёску і там практыкаваліся. Спачатку ў нас ані формы, ані пажарнай тэхнікі ўвогуле не было. Мой брат Ян, які вучыўся кравецтву, пашыў нам шапкі-рагатыўкі. На зборы клікаў нас трывожны гул, які атрымоўваўся ад удараў металічным шпянём па пустым кіслародным балоне. Тады ў лясах валялася шмат металу з разбітай ваеннай тэхнікі, які сяляне збіралі і выкарыстоўвалі ў сваіх гаспадарках. З часам балон заменены быў рэйкай. Потым, яшчэ да прызыву ў войска, у якім я служыў у 1949-1952 гадах, мяне накіравалі на двухтыднёвае абучэнне ў Элк. Там вучылі нас пажаратушэнню. Праводзіліся таксама фізкультурныя практыкаванні, напрыклад, спускаліся мы па канатах з пяціпавярховага будынка.

З часам чарнянскія пажарнікі прыдбалі мотапомпу, з якою на пажар спачатку ездзілі на фурманцы.

— Калі мы займелі мотапомпу, тады сталі мы выязджаць на тушыльныя акцыі, — кажа Аляксандр Дработка. — Тушылі мы пажары ў Макарках, Чорнай-Сярэдняй. У Вырэмбы паехалі мы тушыць агонь на трактары, які цягнуў прычэп з мотапомпай. Паставілі нам тэлефон, які знаходзіўся ў доме Уладзіміра Максімюка. Гэта быў адзіны тэлефон у вёсцы і маглі ім карыстацца вяскоўцы.

У 1950-1960-х гадах пажарнікі ўключыліся ў культурнае жыццё вёскі, а дакладней у самадзейнасць.

— Тады пажарнікі супольна з Колам вясковых гаспадынь (КГВ)пачалі ставіць гумарыстычныя п'есы, званыя ў нас „камэдыйкамі" і паказваць іх не толькі аднавяскоўцам, але і суседзям з навакольных вёсак, — успамінае Аляксандр Дработка. — Наш вясковы драмгурток выязджаў з пастаноўкамі ў Макаркі і Карыціны. Разам з КГВ арганізавалі мы таксама забавы.

— Ставілі мы п'есы „Мараль пані Дульскай" і „Заглоба сватам", — расказвае Данута Разумнік. — Самымі актыўнымі членамі нашага Кола вясковых гаспадынь былі тады Лідзія Цімашук, Вольга Кісель, Ніна Таўкач.

У 1971 годзе Добраахвотная пажарныя каманда ў Чорнай-Вялікай атрымала новую пажарную аўтамашыну маркі „Жук", якой карыстаецца да сённяшняга дня.

— Перад гэтым старшынёй быў Ян Міхноўскі, а я намеснікам, — кажа Мікалай Разумнік. — Ва ўправе былі яшчэ Георгій Луба, Уладзімір Ваўрынюк, Уладзімір Максімюк, Аляксандр Дработка, Ян Дработка, Уладзімір Цімашук. За старой святліцай паставілі мы часовую прыбудову для мотапомпы ПО-3 — яе механікам быў Ян Дэрэвонька. Калі мы атрымалі будынак, у якім раней вялася скупка малака, прыстасавалі яго на гараж і пачалі хадайнічаць перад павятовымі ўладамі за пажарнай машынай. Акурат паехалі мы з п'есай „Мараль пані Дульскай" у Карыціны. Вяртаемся, а тут Урадзімір Максімюк (у яго быў тэлефон) паведамляе, што трэба тэрмінова ехаць у Сямятычы. Заязджаем і бачым новы „Жук" з надпісам на дзвярах „Добраахвотная пажарная каманда ў Чорнай-Вялікай". Прыгналі мы машыну і тут узнікла чарговая праблема, бо дзверы ў гаражы аказаліся замалыя. Тыдзень часу стаяла яна ў мяне на панадворку, пакуль мы пашырылі дзверы.

На гмінных спаборніцтвах у Гродзіску. Злева: Мікалай Разумнік, Уладзімір Ваўрынюк, Яўген Вайцюк, Уладзімір Цімашук, Уладзімір Багнюк, Аляксандр Карадым і Уладзімір Разумнік

Уладзімір Луба

Першая нашая акцыя з прымяненнем машыны „Жук" была ў Замінове. Потым мы прыдбалі дзве новыя мотапомпы, сучасныя шлангі, — працягвае аповед Мікалай Разумнік, шматгадовы начальнік мясцовай каманды. — Выязджалі мы да пажару ў Мерынове, Малінове, Асмолі, Дзядковічах. У вёсцы быў адзін тэлефон і калі дзяжурны пажарнай часці з Сямятыч выклікаў нас на тушыльную акцыю, тады Уладзімір Максімюк прыбягаў да мяне і я ўключаў сірэну, збягаліся пажарнікі і мы выязджалі тушыць пажар. Выклікалі нас таксама на дапамогу падчас рамонту энергетычных ліній пасля буры.

Былі мы на Дзень пажарніка ў Дзядковічах і тады загарэлася вёска Баратынец-Рускі і ўсе сабраныя там пажарнікі спынілі святкаванне і паехалі тушыць пажар, які знішчыў амаль усю вёску.

Былі мы таксама на спартыўна-пажарных спаборніцтвах у Мілейчычах. Занялі мы трэцяе месца на гмінных спаборніцтвах у Гродзіску.

Былі мы на асвячэнні святліцы ў Малінове. Пасля ўрачыстасці пачаўся прыём. Мы былі на машыне. Палкоўнік Пухальскі пытаецца мяне, чаму я не еду дадому. Тады я адвёў машыну ў лес і вярнуўся, бо нашы пажарнікі хацелі пагуляць. За гэта ад каменданта я атрымаў выгавар, — успомніў шматгадовы начальнік каманды Мікалай Разумнік, які пасля выехаў у Сямятычы і там аж да выхаду на пенсію працаваў пажарнікам.

* * *

Цяпер Добраахвотная пажарная каманда ў Чорнай-Вялікай — адна з ліку 65 пажарных часцей, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Сямятыцкага павета. Належыць яна да групы 50 каманд тыпу „С", якія маюць у сваім распараджэнні аўтамашыну. Іх задача — ахова ад пажару сваёй і навакольных вёсак.

Жыццё не шкадуе нам неспадзяванак

У адзін ліпеньскі дзень 1983 года атрымаў быў я з Аўстрыі кніжку. Была гэта беларуская анталогія ў перакладзе на нямецкую мову — з подпісам аўтара для мяне. Прыемны падарунак, толькі выклікаў ён ува мне немалое здзіўленне — я дагэтуль ніколі нават не чуў пра існаванне гэтага чалавека, а ён, аказваецца, ведае мой адрас і абдароўвае мяне цікавай кнігай. Вядома, падзякаваў я за падарунак неадкладна, толькі мінула крыху часу пакуль высветлілася, што гэтае здарэнне адбылося дзякуючы Сакрату Яновічу.

З часам нашае знаёмства з Фердынандам Нойрайтэрам — бо аб ім тут гаворка — змянілася ў сяброўскія адносіны. Быў гэта цікавы чалавек. І чым ён у сваім жыцці не займаўся, дзе не быў, чым не цікавіўся! Калі працаваў у Англіі, пазнаёміўся быў з айцом Надсанам і тады пачалася ягоная цікаўнасць да беларускай літаратуры. З Англіі прывёз ён сабе жонку (з часам ягоны сын ажаніўся з югаславянкай, другі сын за жонку ўзяў сабе беларуску).

Найбольш цікавіўся фальклорам кашубаў у Польшчы. У Зальцбургу ўзначальваў аўстрыйска-польскае таварыства. У перапісцы ягоныя тэксты былі насычаны гумарам. Любіў экскурсіі. Вярнуўшыся з Латвіі, напісаў, што там на кожным кроку сустракаў сляды свайго бацькі, які пасля першай сусветнай вайны ў той дзяржаве „ставіў на ногі" лячэбна-медыцынскую справу... Нойрайтэр быў бадай з усімі беларусістамі Нямеччыны ў кантакце...

А вось пад канец мінулага года я не атрымаў ад яго ні на Каляды, ні на Новы год ніякіх водгукаў. На днях напісала мне ягоная жонка, што з канцом мінулага года закончыўся і зямны шлях аўтара „Weissrussiche Anthologie". Што ж — вечная яму памяць, хаця памірыцца з фактам нялёгка. Ды і задумацца ёсць над чым, напрыклад: чаму чужыя ўмеюць бачыць высокія каштоўнасці ў беларушчыне, а беларусы свайго саромяцца...

Анатоль МАЎЧУН

Новыя кнігі пра Беларускае Адраджэнне

20 красавіка 2008 г. у грамадскай царкоўнай зале Кафедральнага сабора св. Кірылы Тураўскага ў Брукліне адбылася прэзентацыя кніг Зянона Пазьняка „Развагі. Канцэпцыя новага Беларускага Адраджэньня, кн. 1, артыкулы і матэр'ялы (1990 — III.1996)" і Галіны Пазьняк „Беларусь у сэрцы". Кнігі выдадзены і аддрукаваны ў Варшаве выдавецтвам „Беларускія Ведамасці" і ТБК у Вільні ў 2007 годзе.

Грунтоўную характарыстыку і аналіз выданняў зрабіў доктар Вітаўт Кіпель. Выступілі і падзяліліся думкамі Антон Шукелойць, Уладзімер Цяліца, Сяргей Пятровіч, Ларыса Пузач, Сяргей Капытка, Таццяна Красоўская, Валеры Дворнік, а таксама аўтары кніжак. Гэта першая прэзентацыя выдадзеных кніжак.

www.belmov.org

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

З прыстойным узроўнем

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Цэнтральныя элімінацыі XXXVII Дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова”, якія 5 мая сарганізавала ў Гмінным асяродку культуры ў Нараўцы Таварыства беларускай культуры ў супрацоўніцтве з БГКТ, праходзілі ў напружанні і цішыні. Аднак цярплівасць, асабліва ў наймалодшых дзетак, хутка канчаецца. Цяжка было ім выседзець доўга на адным месцы і калі яны самі сышлі ўжо са сцэны і закончыліся выступленні іх равеснікаў, частка дзетак стала шпацыраваць і адпачываць побач дома культуры. Настаўнікаў таксама можна было спаткаць па-за конкурснай залай, бо трэба ж было ім наглядаць за сваімі вучнямі, а таксама завезці іх на абед у школьную сталовую.

— У мінулых гадах мы прыводзілі на конкурс яшчэ і вучняў з нашай школы, па адным класе, але рашыліся не перашкаджаць у конкурсе, паколькі цяжка было заахвоціць іх, каб у цішыні слухалі дэкламатараў. А тут жа і гэтыя скрыпучыя дзверы, — кажа настаўніца беларускай мовы Анна Кандрацюк з Нараўкі.

— Можа конкурс заахвоціў бы да вучобы беларускай мове тых дзетак, якія не ходзяць на заняткі роднай мовы, — разважаю ўголас.

— Калі бацькі не пусцяць на заняткі па роднай мове, малое дзіця само не запішацца. Мы на гэтую тэму размаўлялі з бацькамі, звярталі ўвагу на поспехі нашых вучняў у конкурсах. Тыя бацькі, што самі вучыліся па-беларуску, дзетак запісваюць, а іншыя не хочуць. Можа яшчэ на фэстах заахвочваць, або прасіць бацюшку сказаць аб гэтым у царкве, — гаворыць Анна Кандрацюк.

Хаця вучняў можна было спаткаць па-за домам культуры, аднак зала ў вялікай ступені была запоўнена ўдзельнікамі конкурсу і іх апекунамі. Дзеткі і моладзь уважліва слухалі дэкламатараў.

— Мы не выступаем для перамогі, але для ўласнага задавальнення і хочам, каб наша настаўніца была задаволеная намі. Стараемся паказаць свае ўмеласці і ўдала выступіць ад імя сваёй школы, — заяўляюць дэкламатаркі з шостага класа Падставовай школы № 4 у Беластоку Вольга Мазурук, Ніна Ваўранюк і Лідзія Пякарская. — Наша пані сказала, што мы ўжо не дзеці і можам выступіць з больш цяжкімі для дэкламацыі творамі.

Дзяўчаты з шостага класа дэкламавалі якраз творы Ларысы Геніюш і іх выступленні атрымаліся ўдалымі.

— Я сама падбіраю вершы для дэкламацыі. Вельмі рэдка здаралася, што вучні самастойна або са сваімі сямейнікамі падбіралі творы. Спачатку я чытаю свае прапановы, а дзеткі выбіраюць творы, якія ім падыходзяць. Вучні павінны разумець і адчуваць тое, што гавораць, — кажа настаўніца з беластоцкай „чацвёркі” Аліна Ваўранюк.

— Я падбіраю тэксты пад вучняў, пад іх тэмперамент і здольнасці. Найцяжэй знайсці матэрыял вучням шостых класаў падставовай школы і першых гімназіі, паколькі яны ўжо не дзеці, але яшчэ і не дарослыя, — кажа настаўніца Анна Кандрацюк.

Пётр Давідзюк (Гайнаўка)

Ніна Ваўранюк (Беласток)

Удзельнікаў конкурсу ацэньвала камісія ў саставе: старшыня — віцэ-дэкан Філалагічнага факультэта Універсітэта ў Беластоку доктар Васіль Сегень, метадыст беларускай мовы Іаланта Грыгарук і інструктар Бельскага дома культуры Альжбета Фіёнік.

— Папраўляецца ўзровень дэкламацыі. Штораз цікавейшыя тэксты паяўляюцца на конкурсе і штораз менш паўтараюцца. Відаць, што настаўнікі карыстаюцца новымі зборнікамі і стараюцца падабраць творы адпаведныя ўзросту. Добра падабраны твор гэта палова поспеху. Вельмі добра, што многа малодшых вучняў вучыцца дэкламацыі на творах Віктара Шведа, бо менавіта на іх вельмі ўдала можна гэтаму навучыцца. Добра, што здаралася і проза ў нядрэнным выкананні, — заявіла Альжбета Фіёнік. — Можа ў гімназістаў не ўсе тэксты былі падабраны адпаведна да магчымасцей вучняў.

З ліку больш за 120 дэкламатараў Альжбета Фіёнік пахваліла адважную дэкламацыю дашкольнікаў, сярод якіх былі дзеткі з Беластока, Гайнаўкі, Гарадка і Новага Корніна.

Якуб Андрацкі, які прэзентаваў тэкст на вельмі высокім узроўні, гаварыў пра сваё зацікаўленне беларускай мовай і дэкламацыяй, а яго бацька Збігнеў верыў у яго перамогу.

— Якуб Андрацкі так добра інтэрпрэтуе ад душы, што можна ад яго вучыцца дэкламаваць. Магдаліна і Дар’я Маліш з Комплексу школ у Орлі захапляюць адчуваннем тэксту, правільнымі дыкцыяй і вымаўленнем, — кажа Альжбета Фіёнік.

— Я ў мінулым годзе заняў першае месца і гэта заахвоціла мне паспрабаваць сіл яшчэ раз, — гаворыць Пётр Давідзюк з Гайнаўкі.

Аксана Сычэўская з Гімназіі № 7 у Беластоку ўспомніла пра гран-пры, якое раней атрымала і яно таксама падбадзёрыла яе да сёлетняга выступу. Як пасля аказалася, згаданыя асобы паўтарылі свае поспехі.

— Удзельнікі конкурсу паказалі задавальняючы ўзровень. У агульным добрай была таксама мова дэкламацыі, — кажа старшыня журы доктар Васіль Сегень. — Калі гаварыць пра моўныя памылкі, дык найчасцей паяўлялася няправільнае вымаўленне „л” і здаралася ўчуць „х” замест „г”.

Аксана Сычэўская (Беласток)

— З тэкстамі ў моўным сэнсе найлепш спраўляліся тыя вучні, якія маюць сутыкненне з беларускай мовай па-за школай. Відаць было гэта ў вясковых дзетак, але і ў беластоцкіх вучняў, якія гавораць дома па-свойму, — дабаўляе Альжбета Фіёнік. — У іх правільная мелодыка дэкламацыі, правільныя націскі і чыстае вымаўленне.

Ажно 35 дэкламатараў прыехала з бельскай „тройкі”, што склала больш чым чацвёртую частку ўдзельнікаў мерапрыемства.

— Гэта самы цікавы конкурс, — заявіла Іаанна Марчук. Яе сяброўкі з бельскай школы таксама задаволены выступленнямі ў Нараўцы.

— Ёсць многа цікавых да дэкламацыі твораў, але за імі трэба ехаць у Беларусь і там шукаць у кнігарнях, — удакладніла Аліна Ваўранюк.

Настаўніцы беларускай мовы Вера Флёрчук (Чыжы), Ніна Абрамюк (Нарва), Ніна Куптэль (Дубіны), Тамара Бялькевіч (Гарадок) звярталі ўвагу, што дэкламатарскі конкурс мае ўздзеянне на зацікаўленне беларускай мовай.

— Каб заўважальна пабольшала колькасць навучэнцаў беларускай мовы ў школе, настаўнік мусіць многа круціцца і адных конкурсаў тут мала. Трэба ладзіць экскурсіі, цікавыя сустрэчы, — удакладняе Тамара Бялькевіч са школы ў Гарадку.

— Для большага зацікаўлення навучаннем беларускай мовы самыя важныя школьныя элімінацыі, у якіх у нас прымаюць удзел бацькі, — заўважае Ніна Абрамюк. — А ў нас так многа ахвотных дэкламаваць, што я раблю і класныя адборы.

У катэгорыі дашкольнікаў гран-пры атрымаў Міхал Бабік (Прадшколле № 14 у Беластоку), першае месца — Соня Сульжык (Прадшколле ў Гарадку), другое месца — Магдаліна Шульц, а трэцяе — Оля Буслоўская (абедзве з Прадшколля № 3 у Гайнаўцы).

Сярод вучняў класаў I-III гран-пры атрымала Магдаліна Маліш (Комплекс школ у Орлі), першыя месцы — Дар’я Маліш (Школа ў Орлі), Магдаліна Бабік і Юстына Апольская (абедзве з ПШ № 4 у Беластоку) і Міхал Зіноўчык (ПШ № 3 у Бельску).

У катэгорыі вучняў класаў IV-VI гран-пры трапіла ў рукі Якуба Андрацкага (ПШ у Саколцы), а першыя месцы атрымалі Эвеліна Філіпюк (Вясковы дом культуры ў Рыбалах), Ніна Ваўранюк (ПШ № 4 у Беластоку), Іаанна Марчук і Якуб Мацеюк (ПШ № 3 у Бельску).

З ліку гімназістаў гран-пры атрымала Аксана Сычэўская, а першыя месцы заваявалі Пётр Давідзюк (гайнаўская белгімназія) і Рыгор Красоўскі (бельская „тройка”).

Вершы Віктара Шведа

Які сынок мае зрок?

Маці праверыць хоча
Сынка слабыя вочы.
Вязе сыночка скора
Да акуліста ў горад.

Аднак малы Сярожа
Літар чытаць не можа...
Сказаў сынок з надзеяй:
— Чытаць яшчэ ж не ўмею!

Размова ў парку

— Маю цяжкасці няспынна
Пазнаць: хлопец ці дзяўчына?
Апранаюцца таксама
Кавалеры нашы, дамы.

— Гэта мая доня Натка,
— Дык віншую вельмі татку.
— Я не татка, толькі маці...
— Бачу, цяжка разабрацца.

На Юр'я ў Ласінцы, 6.05.2008

Музыка з кайфам

Капітальныя „Ляпісы"

Калі вядзецца гаворка пра гэты гурт, то заўсёды ўзнікае вялікая бура ў ацэнцы дасягненняў ці ўзроўню „беларускасці" ў іхняй творчасці. Праўдай з'яўляецца факт, што гурт працуе ўжо васемнаццаць гадоў. Калі так, дык немагчыма за гэты час не зрабіць штосьці спектакулярнае! Аднак „Ляпіс Трубяцкой" добра ведае сваю вартасць, таму колькасць фанатаў усё ж такі павышаецца, а яны занадта шмат сабе дазваляюць. Добрым прыкладам гэтаму з'яўляецца ўпэўненасць, якую ўдзельнікі гурту прэзентуюць на сваім афіцыйным сайце. Можам на ім прачытаць пра „самыя паспяховыя альбомы" ці „легендарныя відэакліпы". З другога боку наведальніка атакуе небывалая дыстанцыя да здарэнняў, звязаных з гуртом ці да эфектаў іх творчай працы.

„Ляпіс Трубяцкой" гэта незвычайны гурт, які не баіцца эксперыментаў. Дзякуючы гэтаму мог ён стаць рок-каралём 1996 года ў Беларусі, а зараз сярод сваіх фанатаў мае і любіцеляў музыкі дыска. Хаця, як прызнаюцца, першая іхняя касетка разышлася ў колькасці 20 штук, то з самага пачатку яны ішлі наперад. Смакавалі яны розных музыкаў, хаця лідэрам безупынна з 1990 года з'яўляецца Сяргей Міхалок, што відаць на вокладках іхніх альбомаў. Прабавалі яны розных жанраў, але імкнуліся вельмі доўга граць ска-панк і рэгі, аднак усё ж такі чуваць у іх музыцы натуру рокменаў. Эксперыменты вяліся таксама ў галіне відэа. Першы відэакліп „Аў" паўстаў у 1998 годзе. Затое самы дарагі, зняты ў 2004 годзе амерыканцам Кевінам Джэксанам на песню „Паштальёны", як пішуць „ляпісаўцы", быў самым няўдалым. Сёлетняя „Рокаранацыя" самым лепшым кліпам мінулага года прызнала аднак „Капітал" гурту „Ляпіс Трубяцкой"!

Варта дадаць, што дарога да поспеху вяла таксама праз суседнія краіны, напрыклад Расію ці Украіну, дзе „Ляпісы" карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Можа таму, што за мяжой у слухачоў больш пачуцця гумару,

чым у беларусаў. „Ляпіс Трубяцкой" гэта гурт веселуноў і жартоўнікоў, што відавочна не толькі ў відэакліпах, але і ў графіцы альбомаў ці на сайце гурту. Жартам таксама здаецца велічыня канцэртнага ганарару, які ідзе ў тысячы еўра, але гэта не жарт, а доказ вялікай папулярнасці гэтага гурту. Таму, мабыць, часцей яны граюць за межамі радзімы, выдаюць замежныя версіі сваіх альбомаў і проста цешацца жыццём музыкантаў.

i_basovka@o2.pl

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, КАЛІ ЗАКВІТНЕЮЦЬ ВІШНІ

А яшчэ раскажу вам гісторыю, якая цяплейшая за любую вясну і прыгажэйшая за любую кветку. Таццянка развіталася з Ігарочкам так даўно, што нават і сама не памятала. Магчыма, была жоўта-барвяная восень; а можа, белымі завеямі студзіў вусны снежань. Ён проста паехаў, і ўсё. І — ні вестачкі, ні званочка, ні гучку.

Але! Яна ведала. Яна проста адчувала душою і сэрцайкам, што ён — прыедзе. Ішлі дні, гадзінкі ляцелі, хвілінкі ападалі тым белым кветам, з якім так імклівa-незаўважна падступіў да вокнаў Таццянкі цёплы, усмешлівы травень.

Толькі яшчэ за тым акном расла невялічкая вішня, якая ўпарта не хацела квітнець. Вось ужо і асыпаліся сваёй белапеннасцю практычна ўсе дрэвы, а вішня — Таццянчына вішня — толькі-толькі набрыняла пупышкамі сваёй квецені. Штораніцы дзяўчына выходзіла ў двор, набліжалася да дрэўка, асцярожна кранала рукамі галінкі — пупышкі нібы сцяліся, як і ейная душанька, і ўпарта не хацелі выстрэльваць сваімі духмянымі белымі ўсмешкамі насустрач сонейку.

А ў тую раніцу! О, у тую раніцу гэта здарылася так іскрыста і так нечакана! Таццянка выйшла на вуліцу і першае, што яна ўбачыла, — бурлівае мора квецені пад акном. Гэта квітнела вішня! І яна рассмяялася — голасна, звонка, шчасліва. І, ужо не вяртаючыся дахаты, забыўшы пра недапітую гарбатку на стале, выйшла за веснічкі.

Яна ішла па вуліцах, і імклівыя сонечныя зайчыкі беглі папарадзе дзяўчыны. Яны скакалі гарэзамі дзе маглі, яны ўсмешліва зазіралі ёй у вочы. І зноў навокал квітнелі дрэвы, якія даўно ўжо асыпаліся, а ў небе адначасна свяцілі і сонейка, і месяц. Ляцелі птушкі і цалавалі сваімі дзюбкамі ў вусны Таццянкі. Раптам слёзкамі пырснуў дождж, струменьчыкамі збягаючы з тонкіх дзявочых пальцаў. І дзе падалі струменьчыкі на зямлю — там вырасталі гукі шчымлівай травеньскай песні. Песні пра пяшчоту і расставанне. Пра незгасальнае вогнішча залаціста-сакрушальнае адзіноты. Пра роўны, прыціхлы і разам з тым такі гучны, імклівы пульс штохвілінных чаканняў і веры.

Яна проста ішла, проста смяялася, ніла на поўныя грудзі гэты пяшчотны, гэты пенна-чысцюткі травень. І нават не заўважыла, як прыйшла на вакзал, як спынілася раптам, калі...

Калі нарэшце ўбачыла свайго Ігарочка. Ён стаяў на тым самым месцы, дзе развіталіся яны калісьці; ужо гэтак далёка і ў гэткім далёкім... Ён проста глядзеў на яе — і немагчыма было адарваць вачэй ад ягонай усмешкі. А можа, наадварот: гэта ён не мог адарваць вачэй ад сваёй — мілай, любай, цудоўнай — Таццянкі. Якая так нагадвала — белую-белую вішню.

Ваш Дзядзечка Сід

25 красавіка 2008 г., Кобрын

Польска-беларуская крыжаванка № 20

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 16:

Параход, ура, коска, кандуктар, конкурс, на, шалі, мак, рацыя, суп, ножка, які, грам, ар. Душа, карак, ара, кола, раніца, банк, дуля, шкура, на, бокс, мост, муж, канапка, падарунак, ар.

Узнагароды, каляровыя алоўкі, выйгралі: **Дыяна Капытка, Эвеліна Ігнацюк, Мажэна Дмітрук** з Чыжоў, **Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага, **Малгажата Гаворка, Паўліна Юрчук** з белгімназіі ў Гайнаўцы. Віншуем!



Апошняе развітанне

Памяці Сястры Ніны

Сястра мая родная Ніна
Была найвялікшым прызнаннем.
Не ведаў, што ў Элку хвіліны
Нашым былі развітаннем.

Пагаварылі нямнога...
Аб справах блізкіх нам, родных.
Сказала мне, просіш Бога
Да Свят каб дажыць Велікодных.

Пад добрай апекай была Ты
Сям'і дарагога сына.
Аднак будуць сумныя Святы,
Ад нас адыходзіш Ты, Ніна.

Была спрацаваная дужа,
Хвароба забрала ўсе сілы.
Ідзеш у зямельку да Мужа,
Спачыць у супольнай магіле.

Мы толькі госці на свеце,
Смяротнікі Святога Духа.
Хай Бог Цябе мае ў апецы,
Зямелька няхай будзе пухам.

Віктар ШВЕД
Мора, 26 красавіка 2008 г.

Добры і благі характар

(працяг з 2 старонкі)

беларусаў вылучаючых іх як асобную супольнасць. Можа, такія дыскусіі непатрэбныя, а, можа, сёння яны непапулярныя. Запамяталіся мне думка аб „дабрарусі" польскага пісьменніка Тадэвуша Канвіцкага, таксама невялікая кніжачка Сакрата Яновіча аж да эсэ Уладзіміра Паўлючука, народжанага ў Рыбалах на Падляшшы, як заўжды ў гэтага пісьменніка інтэлігентнай і бліскучай, хоць вельмі дыскусійнай, спробы ўлаўлення беларускай спецыфікі.

Паўлючук нацыянальны характар беларусаў спалучае перш за ўсё з каталіцызмам, у сувязі з гэтым нацыянальная свядомасць мусіла пахіснуцца разам з упадкам каталіцызму ў Беларусі. Набліжае гэта Паўлючука да думкі вялікарасаў аб Беларусі як аб „польской выдумке". Зрэшты, Паўлючук здаецца захапляцца сілай і магутнасцю ўсёрасійскай ідэі (ах, тыя інтэлектуалы, якіх зводзяць моц ды ўлада!), таму Беларусь як краіна, распаложаная дзесьці на ўскраіне Еўропы прайгравае, таму наканавана ёй параза. Пазіцыя Паўлючука набліжае яго да мысляроў з кола еўраазіятызму, якія патрабуюць адраджэння магутнай імперыі з-пад знака праваслаўнага сацыялізму, а супрацьстаўляюць яму быццам бы хворую, заражаную гніллю і распадам заходнюю Еўропу.

Што ж тут можна яшчэ дадаць? Мабыць, такія народы, якая ў іх праслойка інтэлігенцыі, таму што ад якасці інтэлігентаў залежыць росквіт народа, яго лёс. Адной з фатальных рыс даўнай камуністычнай імперыі было тое, што беларуская інтэлігенцыя, якая пратрывала гады сталінскага тэрору, была зведзена да сітуацыі клуба аматараў, заязтараў, да гета, быццам клуб шахматыстаў або калекцыянераў паштовых марак, а той клуб аддзялілі ад люду, не настолькі адукаванага, можа і ненадта разумнага, а звычайна няшчаснага і прайгранага, таго, што робіць, прывязаны да напружанай, цяжкай, стамляльнай работы, якая не гарантуе яму росквіту розуму. А такі люд пераважае пад нашым неспакойным небам, пад небам усіх дзяржаў і народаў. Люд наогул застаецца ў самоце ў сутычцы з нячулым на яго праблемы чыноўнікам, бюракратам; для ўстановы павінен ён быць роўны, аднародны, быццам пазбаўленыя душы лікі ў статыстычных калонках.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Да пяцідзесяцігоддзя аб'яднання **БЕЛАВЕЖА**

Дзмітры Шатыловіч — паэт-вандроўнік

Міра ЛУКША

Дзмітры Шатыловіч — адзін з самых першых, хто свае роздумы на роднай мове даслаў Георгію Валкавыцкаму, галоўнаму рэдактару беларускага тыднёвіка ў Польшчы і арганізатару літаратурнага ды грамадскага руху на Беласточчыне. Цяпер ён сівавалосы, пенсіянер ужо, як тадышнія пачаткоўцы, ды ўвесь час адзін з самых плённых, асабліва ў апошні час — амаль штогод выпускае ён кнігі лірыкі, успамінаў. Які быў ягоны шлях, чалавека сціслага розуму, будаўніка, у беларускае слова?

— Літаратурную беларускую мову пазнаў я толькі ў 1939 г., калі пачаў вучыцца ў шостым класе савецкай Беларускай няпоўнай сярэдняй школы ў Бельску-Падляшскім. Да гэтага часу я не чуў беларускай літаратурнай мовы, бо ў навакольных вёсках, дзе я жыў, усе гаварылі на палескім дыялекце, фанетычна падобным на ўкраінскую мову, а ў школе тады вучылі толькі на польскай мове. Рускую мову я пазнаў яшчэ ў маладосці, бо бацька мой добра яе ведаў і ў пяць гадоў навучыў мяне чытаць па-руску з рускага буквара і я нават тады чытаў матцы Евангелле на рускай мове. Таму я ў 1939 г. хутка асвоіў беларускую мову і ў школе пры дапамозе настаўніцы напісаў некалькі вершаў у школьную насценгазету. Аднак вучыўся я беларускай мове тады няпоўныя два гады. Прыйшла акупацыя і ў сакавіку 1943 г. выслалі мяне ва Усходнюю Прусію на прымусовую працу. Там з беларускай мовай я не сустракаўся, два разы толькі трапіла мне ў рукі беларуская газета, надрукаваная ў Берліне. А выпісваў я з Берліна рускую газету „Новое Слово", якую выпускалі ў Берліне рускія эмігранты. У лютым 1945 г. папаў я ў Савецкую Армію, дзе служыў да канца гэтага ж года і там беларускай мовы не чуў, нават калі служыў пад Бабруйскам. Аднак я часам стараўся пісаць сабе ў сшытку вершы на беларускай мове. На роднай мове напісаў я тры вершы, калі паранены ляжаў у ваенным шпіталі ў Зеебургу, аб першых маіх успамінах з лініі фронту. Я іх змясціў у зборніку „Струмені лёсу". З беларускай мовай сустрэўся я ізноў у чацвёртым класе Беларускай гімназіі ў Бельску-Падляшскім у 1946 г. Гэтую гімназію польскія ўлады хутка ліквідавалі і я быў прымушаны закончыць у 1948 г. польскі ліцэй імя Тадэвуша Касцюшкі ў Бельску-Падляшскім.

— ***Вучыцца вас адправілі ў Савецкі Саюз, таксама як аднаго з таленавіта паказваючых сябе маладых беларусаў — як Міхася Хмялеўскага, Міколу Гайдука...***

— У кастрычніку 1948 г. выслалі мяне вучыцца ў Ленінградскі электратэхнічны інстытут, які закончыў я ў снежні 1953 г. Там беларускай мовы нідзе не чулася. Ад сакавіка пачаў я працаваць у Варшаве ў праектным бюро, дзе толькі гаварылі па-польску...

— ***А калі была першая сустрэча? З беларускім словам?***

— Вось у Варшаве я нечакана спаткаў хіба ў 1957 г. у кіёску „Ніву", зацікавіўся ёй і пачаў рэгулярна яе купляць і чытаць. І пад канец 1957 г. ці на пачатку 1958 г. выслаў я ў „Ніву" свой першы верш „Падляшша", які быў надрукаваны. Гэта заахвоціла мяне і я пачаў далей пісаць вершы і высылаць іх у рэдакцыю, хаця меў мала часу і не меў пры сабе ніякіх беларускіх слоўнікаў. І раптам атрымаў я запрашэнне на семінар у рэдакцыю „Нівы". Паехаў я туды і пазнаў галоўнага рэдактара „Нівы" Георгія Валкавыцкага, Сакрата Яновіча, Яшу Бурша і іншых карэспандэнтаў, сустрэў Віктара Шведа, якога я ведаў яшчэ з 1946 г. з Беларускай гімназіі. Аказалася, што ў Варшаве мы жылі ў адным блоку па вул. Лавіцкай, толькі ў розных пад'ездах. Віктар Швед працаваў у Варшаўскім аддзеле БГКТ па вул. Сенатарскай, куды я часта заходзіў у вольны час. Там пазнаёміўся я з Алесем Баршчэўскім, Юрым Туронкам, Хведарам Галёнкам, Пятром Ластаўкам і іншымі. Там адбыліся два ці тры семінары, на якіх чытаў я свае вершы. Швед тады часта гасцяваў з цэлай сваёй сям'ёй у маёй кватэры і мая сям'я ў яго, пакуль ён не разышоўся са сваёю жонкаю.

— ***8 чэрвеня 1958 г. вы былі на І З'ездзе Беларускага літаратурнага аб'яднання?***

— Не, хаця я быў запрошаны. У сувязі з тым, што я многа часу праводзіў на аўтарскіх наглядах у электрастанцыях — Конін, пасля Туруў, Понтнуў, я не меў часу ездзіць на семінары на Беласточчыну і быў толькі раз у Бельску-Падляшскім у Беларускім ліцэі і сустрэўся тады з яго дырэктарам Яраславам Кастыцэвічам, якога ведаў яшчэ з 1946 года.

— ***Як вам успамінаецца той час?***

— Вельмі добра ўсіх успамінаю. Юрка Валкавыцкі быў для мяне чалавекам незвычайным. Дзякуючы яму існуе да сённяшняга дня Літаб'яднанне „Белавежа". Ён памагаў маладым творцам выйсці на сцэну. Хоць сам ён паэт, то аднак вышукваў і фаварызаваў усіх іншых. І многія з нас дачакаюцца пяцідзесятай гадавіны літаб'яднання „Белавежа". Усе яму павінны быць удзячны. Хаця калісь на семінары Андрэй Сошка (Вацлаў Асіповіч) скардзіўся мне на Валкавыцкага, што ён не хоча ў „Ніве" друкаваць яго вершаў, што яго быццам бы ігнаруе. Мае ўсе вершы, якія я выслаў у „Ніву", былі надрукаваны на яе старонках. Да Віктара Шведа ў мяне вялікая ўдзячнасць. Ён закончыў у Варшаве беларускую філалогію і выдатна валодае беларускай мовай і мне ў многім памог. Ён заахвоціў мяне і дапамог мне выдаць першыя два зборнікі вершаў. У яго была беларуская друкавальная машынка, якую ён прывёз з Мінска і ён перапісаў на ёй тры мае зборнікі вершаў, каб я іх мог пераслаць у друкарню. З 2000 г. я стаў пісаць на камп'ютэры і высылаю свае зборнікі ў друкарню пры дапамозе інтэрнэту. З дзевяці выдадзеных да сённяшняга дня зборнікаў вершаў для васьмі Швед з'яўляецца іх рэдактарам і карэктарам. Вельмі добра ўспамінаю Сакрата Яновіча і вельмі цаню яго творчасць. Дзякуючы „Ніве" і Георгію Валкавыцкаму ды сваёй пазнейшай творчасці стаў ён вядомым пісьменнікам не толькі ў Польшчы, але і ў іншых дзяржавах. Вельмі цаню ўсіх членаў Літаб'яднання „Белавежа", з якімі сустракаюся на семінарах. Часта гутару па тэлефоне з Васілём Петручуком. Высылаю заўжды святочныя пажаданні Галіне Тваранавіч і Яну Чыквіну, лістуемся... Я перш за ўсё вельмі ўдзячны Г. Валкавыцкаму, што пры яго дапамозе друкаваліся ўсе мае вершы, якія я высылаў у „Ніву", а пасля паявіліся ў „Руні" і ў іншых беларускіх альманахах і ў беларускіх календарах, пакуль ён быў галоўным рэдактарам „Нівы". Хутка будзем святкаваць юбілей пяцідзесяцігоддзя Літаб'яднання „Белавежа". Многія старыя пісьменнікі і паэты дачакаюцца гэтага дня. А ён, наш Рэдактар, дачакаўся 85-гадовага юбілею. Ён многіх нас заахвоціў да творчасці на беларускай ніве і памяць аб ім у беларускім літаратурным руху застанецца на доўгія гады.

— ***Чаго можам пажадаць „Белавежы"?***

— Каб у яе радах з'явілася больш маладых пісьменнікаў і паэтаў і каб больш кніг і зборнікаў вершаў яны друкавалі. А старыя пісьменнікі і паэты, па меры магчымасці, каб яшчэ пісалі і друкаваліся.

— ***І Вам — каб пісалася, рэалізавалася запланаванае.***

— Пакуль маю сілу, стараюся пісаць і выдаваць свае вершы. У гэтым годзе выйшаў у свет мой новы, дзевяты, зборнік вершаў, восьмы на беларускай мове — „Гронкі надзеі", у 102 старонкі, які можна знайсці ў інтэрнэце ў „Камунікаце". Калі будзе здароўе, дык буду старацца ў наступным годзе выпусціць у свет свой дзесяты (дзевяты на беларускай мове) зборнік вершаў. Амаль палову яго маю ўжо на дыску камп'ютэра.

— ***Ну, дык з новай тэхнікай і новымі сіламі — у наступнае пяцідзесяцігоддзе!***

Святкавалі ў аўторак

Успаміны Марыі ХІЛІМАНЮК з Целушок, народжанай у 1923 годзе.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Я з самага маленства помню, як прыхільнікі Ілы Клімовіча ў нашу вёску хадзілі. Шмат людзей ішло з нашай вёскі, з Паўлаў, з-за рэчкі — з Катлоў многа прыходзіла. А хадзілі ўсяляк, і з сямейным разладам. Бо хадзілі абое, муж з жонкай, або адно ішло, а другое не. Спярша хіба нават такой хаты не было, каб хто да іх не хадзіў. Майго чалавека маці хадзіла, а бацька не; і мой муж не хадзіў, так як і ягоны бацька. А мужаў брат, нежанаты, правіў у гэтай царкве. Службы правілі ў хаце, што з другога боку вуліцы стаяла. Хацелі з яе зрабіць царкву. Ужо і званы прывезлі, з Тарнопаля. Папрыходзяць з іншых вёсак, тут такі шум-крык рабіўся, маліліся, крычалі, і чаго яны не выраблялі. Таксама хадзілі ў Грыбоўшчыну, пяшком, мала хто з нашай вёскі там не быў. Лічылі, што ад нас у Грыбоўшчыну было сорак кіламетраў, але пяшком хадзілі. А сюды найбольш сходзіліся па святах. Пасля задумалі аўторак святкаваць, бо калісь казалі, што святкавалі ў суботу, а пасля атрымалася васкрэсенне ў нядзелю; то яны лічылі, што калі цяпер у нядзелю святкуюць, то будзе васкрасенне ў аўторак. З гэтага назвалі іх уторнікамі. Майго чалавека маці не святкавала ў аўторак, а брат святкаваў; і старыя лічылі яны святы, і па-новаму — па аўторках, як то мелі быць святы.

Калісь людзі ўсялякія былі і людзей поўная вёска была, не так як цяпер, то нават такія знаходзіліся, што разганялі іх, бо кажуць: што тут ужо робіцца! Але яны не слухалі, толькі маліліся ў адной хаце, дзе два браты жылі. Пасля з тае хаты, дзе яны жылі, хацелі зрабіць царкву, а братам другую хатку сталі ставіць са свайго лесу. Ужо нават высока зруб узвялі, але немцы ім далей не далі, запячаталі. А пасля тую хату разабралі. І калі наставала субота, то ўжо вячэрня ў іх была, званілі, кідалі работу і ішлі маліцца. І з чужых вёсак прыходзілі. Адпраўляў майго чалавека брат Пятро. Пашылі яму тут самі рызу з плахты і ён адпраўляў.

Спярша ў царкву ў Пухлы яны прынеслі ікону такую з Пачаева; і цяпер яна там над царскімі дзвярамі. І папрыходзяць у царкву і тую ікону спускаюць і перад ёю паклоны б'юць. То бацюшка ім забараніў рабіць такі тлум у царкве. То яны перасталі ў царкву хадзіць, толькі самі сталі маліцца ў той хаце. І сталі па-свойму ўсё рабіць. І сюды збіраліся; з Паўлаў было многа. Прыходзілі і з іншых вёсак, поўная тая хата іх збіралася. Нічога дрэннага яны не рабілі: пазбіраюцца, адслужаць так як яны ведалі, паспяваюць, і абед нарыхтуюць, і разыдуцца. А ўсярэдзіне ўсё было, і крыжы, і ікон было многа. Бо яны хадзілі ў Пачаеў пяшком, прыносілі іконы, яшчэ і цяпер такая ікона якую насілі ёсць у нашай царкве. І як у Пачаеў ішлі, то яны збіраліся і праз вёскі ішлі, там затрымліваліся, і навучалі людзей, як гэта трэба каб было. Хадзілі па некалькі разоў у год. І то такія гаспадары былі, што кідалі работу, дзяцей з жонкай, а калі жонка ішла то чалавек аставаўся. А пасля нешта на іх такое найшло, што яны ўсё павыкідалі; і іконы таксама. Тыя іконы людзі разабралі — тыя, што насупраць жылі, то такіх харошых ікон набралі! А была ж там, помню, такая прыгожая ікона з Георгіем Пабеданосцам. І Серафім Сароўскі, і то такія вялікія.

Бо пабачылі яны, што нічога ў іх не выходзіць, так як яны думалі. І так усё ў іх растраслося. А званы прадалі яны ў нашу царкву. А харошыя тыя званы былі. Але ў нашай царкве іх таксама няма, бо ў нас былі свае званы і тыя ад уторнікаў стараста кудысь прадаў.

А з нашай вёскі ў Пухлы больш людзей хадзіла чым сюды; сюды мо хадзіла толькі трэцяя часць. З іншых вёсак найбольш хадзілі парамі, абое: жонка з мужам. І так бывала, што збіраліся і кудысь ішлі па дарогах. Быў чалавек з Пянькоў, ён калісь дыяканам быў, то ён далучыўся да гэтага святэнства, і ён багагласнік песень напісаў. О, такая была песня:

С кончиной света слов Христовых
Вселилось зло в сердцах людей,
Умы закрылись для всех новых
Родившихся от матерей.

Без просвещения рождались
От беззаконных всех людей,
Светом Христа не просвещались
Во всей земной жизни своей.

Плачте за то что возлюбили
Широку путь разгульную
И похоть плоти возлюбили
И предавались воли злой.

Плачте за то что не прощали
Грехов обиды злым людям,
Прощальну заповедь вы знали
И Божий Сын не простит вам.

І такіх песень быў багагласнік. І той чалавек з Пянькоў, што за Міхаловам, быў тут у вялікай пашане. А пасля атрымалася так: там з Катлоў, з-пад Бельска, многа людзей сюды прыходзіла. А пасля той з Пянькоў пакінуў сваю сям'ю, жонку, дзяцей, і пайшоў, бо з Катлоў такая дзяўчына старэйшая прыходзіла сюды, і ён пайшоў да тае дзяўчыны. І ён раз прыйшоў да нас, бо ж чалавека брат быў тут свяшчэннікам. І той брат на яго ўсяк, што як ён так мог зрабіць, што *прелюбодейник*, пакінуў жонку і дзяцей і пайшоў да такое-о жыць. Гаварыў ён яму, гаварыў, а той кажа:

— Ну і што, Пятро: усё?

— Усё.

— Ну то я цяпер табе скажу. Харашо, на ком харошае, але што здзелаць, на ком і плахое? Як я песні пісаў, як вы мяне акружалі, як вы мяне паважалі! Але я заснуў і мне з'явіўся старычок і сказаў мне так: „Харашо як я цябе павёў на харошае, але што ты будзеш дзелаць, як я павяду на плахое?" То я сказаў, што я падумаў, што дзе ты мяне не павядзеш, то я скрось пайду. Але бач, дзе мяне павяло? Я не думаў, што мяне так павядзе.

І ён астаўся ў Катлах, а чым гэта кончылася, я ўжо не ведаю. А майго чалавека брат правіў тут сам адзін. Ён рызу меў і амаль усё на памяць знаў. І правіў так як у царкве. Нават адну пару вянчаў: малады быў з Расіі, а маладая была з Целушок; пасля вайны яны выехалі ў Расію. Але зрабілі такое вяселле, і з вёскі ўсе пазбіраліся, і іхнія найбольшае святэнства, спяваючы прыйшлі сюды, павянчаліся, і зноў спяваючы пайшлі. І гасціна была так як трэба; усё. А ці іх тут хто запісаў — невядома.

І як тое ўсё раскідалася, то некаторыя з тых вернікаў змірыліся з Царквою. І мужаў брат, што тут адпраўляў, таксама змірыўся і ўжо жыў разам з намі.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Дзень перамогі

Марыя МАНАХОВІЧ

Быў гэта самы шчаслівы і радасны дзень у маім жыцці. І хаця з таго часу прайшло шмат гадоў, то нягледзячы на такі адлеглы час, усё ўспамінаецца і вобразы таго дня стаяць перад вачыма. Нялёгка ўсё апісаць, але пастараюся тыя здарэнні прыблізіць чытачам.

Гэта было на чужыне ва Усходняй Прусіі ў горадзе Інстэрбург, у якім знаходзілася амаль сто ваенных шпіталяў. У адным з іх я працавала санітаркай, а начальнікам нашага шпіталя быў палкоўнік Залкінд. У сакавіку Чырвонай Арміяй была вызвалена Усходняя Прусія, але на захадзе яшчэ ішлі крывавыя баі і адтуль прывозілі нам раненых салдат, якім неабходна была дапамога. Многія з іх вельмі цярпелі: некаторыя былі без адной нагі або без рукі, а адзін салдат быў страшэнна абгарэлы. На яго твары быў адзін струп, ён не мог нармальна прымаць ежу і толькі маленькімі кусочкамі я яму падавала хлеб з маслам і маленькай лыжачкай уліваля каву ў рот, якога ён сам не мог разявіць.

Быў прыгожы майскі вечар. Перад нашым шпіталем сабралася шмат людзей. На тварах прысутных малявалася вялікая радасць. На небе зіхацелі рознакаляровыя агні. Салдаты паўсюдна стралялі з вінтовак. Усе вельмі цешыліся, смяяліся. Побач са мной стаяў салдат, які таксама страляў. Я папрасіла ў яго, каб даў мне сваю вінтоўку, бо і я хачу выстраліць у гонар перамогі. Салдат згадзіўся. Гэта быў мой адзіны выстрал, выстрал вялікай радасці ў дзень перамогі.

На другі дзень на плошчы перад шпіталем танцавалі пад гармонік, на якім прыгожа іграў малады афіцэр. Горад быў прыбраны сцягамі і транспарантамі. Прыгожа выглядала свежая майская зелень і рознакаляровыя кветкі. Цешыліся ўсе, хто на чужбіне дачакаў таго шчаслівага дня, а такіх людзей было вельмі многа.

Немцы забіралі моладзь на прымусовыя работы. З маёй мясцовасці найчасцей вывозілі ва Усходнюю Прусію, многія былі ў горадзе Кёнігсберг (цяпер Калінінград). Я не раз туды ездзіла з сяброўкай Надзяй, якое брат там працаваў. Сустракалі мы аднасяльчан. Працавала я ў горадзе Пройсіш Эйляў, у які нас прывезлі ў жніўні 1943 г. Гэта быў невялікі горад, а побач чыгункі знаходзіліся склады. Сюды немцы прывозілі розныя тавары, якія мы выгружалі, або грузілі на вагоны патрэбныя ім тавары. Раней у гэтых складах працавалі толькі немцы, а ў час вайны пачалі ставіць сюды на працу чужаземцаў, а нават ваеннапалонных французаў, італьянцаў і рускіх. Найпазней сюды прывезлі рускіх нявольнікаў. Гэта былі маладыя людзі, які не маглі нармальна трымацца на нагах, — так былі вымучаныя голадам. Рускія ваеннапалонныя страшэнна пакутавалі ў няволі. Вельмі многія з іх уміралі ў лагерах, а тыя, што выжылі, былі страшэнна змардаваны ўмовамі, у якіх іх трымалі. Яны не атрымлівалі ніякай дапамогі ад Чырвонага крыжа, у адрозненне ад іншых нявольнікаў, бо, паводле Сталіна, той, хто трапіў у няволю, гэта „изменник родины". Ніхто не пытаўся, у якіх умовах людзі траплялі ў няволю, а на фронце былі розныя сітуацыі. Яны нам гаварылі, што ім тут вельмі цяжка, а на радзіме таксама нічога добрага іх не чакае. На вопратцы рускіх нявольнікаў віднелі вялікія белыя надпісы SU. Было іх відаць здалёк.

Ваеннапалонныя з іншых краін выглядалі зусім інакш. Яны хадзілі ў сваіх ваенных мундзірах без канвою ў горад, атрымлівалі дапамогу ад Чырвонага крыжа. Рускіх нявольнікаў прыводзіў на работу нямецкі жаўнер, а пасля работы адводзіў у барак, з якога нельга было ім выходзіць. Аднойчы невялікая група рускіх нявольнікаў прабавала ўцячы, але іх хутка злавілі і страшэнна пабілі на вачах сяброў, каб і іншым была асцярога.

Цяжка было на чужбіне. Думкі аб родным краі не давалі спакою. Часам здавалася, што вайна ніколі не скончыцца і на сваю радзіму не зможам вярнуцца.

Пасля вызвалення гэтых мясцовасцей, дзе мы працавалі, шмат прымусовых работнікаў накіравалася на захад. Некаторыя ішлі пехатою, іншыя ехалі на фурманках або на роварах. Мы ішлі пехатою, а ўвесь наш дабытак везлі на роварах. Так мы дайшлі да горада Бартэнштэйн. Здавалася мне, што калі за адзін дзень мы прайшлі 30 кіламетраў, то праз 10 дзён, ну хай праз 2 тыдні, мы зможам вярнуцца на радзіму. Я так разлічвала таму, што мела карту, на якой памячала ўсе мясцовасці, праз якія нас везлі ў Прусію.

Атрымалася зусім інакш. У горадзе Бартэнштэйн нас затрымалі вайсковыя. Усіх хлопцаў забралі і скіравалі на фронт без ніякай падрыхтоўкі. Многія з іх загінулі: Іван Белаказовіч з Відава, Павел Лазовік з Сакоў, Васіль Бялецкі з нашай вёскі і іншыя. Дзяўчат накіравалі на зборны пункт у горад Інстэрбург. Мы з нецярплівацю чакалі выезду ў родны край, але атрымалася зусім інакш. Аднойчы прыйшоў савецкі афіцэр, які звярнуўся да прысутных дзяўчат: „Девочки, вас освободили красноармейцы, многие из их ранены и нуждаются в помощи, вы должны им помочь, работая в военных госпиталях". Ён выбраў 10 дзяўчат, сярод іх і мяне, і на грузавой машыне павёз у шпіталь імя Залкінда. Мне было вельмі цяжка глядзець на гэтых пакалечаных людзей. Некаторыя з іх нават жартавалі: „Сестра, утку, и сама на минутку"!

Памятаю, як я аднойчы зайшла ў палату і ўбачыла, што адзін ранены нічога не еў — падумала, што ён спіць, але яго сябра сказаў мне, што ён ноччу памёр. Аднойчы пакойнага афіцэра з аркестрам праводзілі на могілкі за горадам. Пайшла і я з сяброўкамі. Якія могілкі я там убачыла — не магу забыць! На агромнай плошчы ў пару гектараў у роўненькіх радах былі магіла пры магіле, усе ацэментаваныя. Пры кожнай магіле помнік, на якім пералічаны імёны і прозвішчы пахаваных салдат з дапіскамі „погиб" або „умер от ран". У кожнай магіле ляжалі 8 або 9 салдат, толькі афіцэраў хавалі па адным.

Дзень перамогі для мяне — вялікае свята. Ужо 63 гады жывем пад мірным небам. Залечаны раны вайны. Красуецца наша сталіца Варшава, якая была адной руінай. Па вуліцах Варшавы тады не толькі нельга было праехаць, але нават і прайсці.

Пра Сопат, які прытуліў „Хатку”

Тэкст і фота Міхала КУПТЭЛЯ

Аб тым, каб падзяліцца з чытачамі весткамі пра Сопат, з якім я звязаны ўжо больш чым сорак гадоў, думаў я даўно. Мучыла мяне аднак сумненне: чаму пісаць пра Сопат, якія ў яго сувязі з беларусамі і з беларускімі справамі? Ляжыць жа ж ён сотні вёрст ад роднай мне Гайнаўшчыны! Пісаць заахвочвае таксама сябра Уладзімір з Кузавы, але ці ніўскага чытача зацікавіць гэты горад. Сваімі сумненнямі падзяліўся я са старшынёй „Хаткі” Ленай Глагоўскай.

— Паколькі „Хатка” мае сядзібу ў Сопаце, — кажа старшыня, — то ты маеш права пісаць пра сядзібу Беларускага культурнага таварыства „Хатка”. Тым болей трэба пісаць пра Сопат, бо калі па гадах блукання па акраінах Гданьска, і ў момант, калі мы амаль не апынуліся на гданьскім бруку, не хто іншы як толькі Сопат прытуліў Таварыства, адвёў „Хатцы” памяшканне па вуліцы імя заснавальніка санаторных сопацкіх амбулаторый Жана Жоржа Гафнера, у будынку пад нумарам 27 А.

Маем мы там сваё месца і свой час (па суботах і нядзелях) на спатканні ў сваім асяроддзі ці то з нагоды ўрачыстых гадавін, ці ў арганізацыйных справах.

Пішу, што Сопат прытуліў нас, бо фактычна даў нам прыстанішча і не чакае ад нас арэнднай платы за карыстанне памяшканнем. Хтосьці можа сказаць, што Сопат — самы багаты горад Рэчы Паспалітай, калі да-

памагае такім таварыствам як „Хатка”. Аднак вядома, што не кожны багацей дзеліцца сваім багаццем з іншымі.

„Sopot ma właściwy wymiar. Jest większy niż prowincjonalne miasteczko, w którym człowiek się dusi, i mniejsze od molocha, gdzie ludzie dostają histerii od anonimowości. Sopot skrojony jest, że tak powiem — na ludzką skalę”, — так бачыла Сопат Агнешка Асецкая, паэтка, у 1992 г. („Sopot”, Marek Klat, Jarosław Mykowski, 2001, album wydany z okazji 100-lecia Sopotu).

„Людскі маштаб” перш за ўсё відаць па-за турыстычным сезонам. Значыць тады, калі вясенне-летні натоўп турыстаў раз’язджаецца, а Сопат па апошніх фестывальных гуках па-асеняму ціхне. Тады пастаянныя жыхары Сопата могуць пакарыстацца „люскім маштабам” горада пры шклянцы піва ў многіх адкрытых яшчэ піўных агародчыках і кафейках.

Дахаты па уік-эндах прылятае актуальны прэм’ер-міністр, з Сопатам звязаны галава дзяржавы — прэзідэнт РП. У Сопаце жывуць актуальныя і былыя міністры. Сопат згуртоўвае найбольш паэтаў на квадратны кіламетр (апрача, ясная справа, усходняй Беласточчыны), не ўспамінаючы пра мастакоў, акцёраў ці

вучоных. У Сопаце працуюць тры тэатры, камерны аркестр (нічога, што камерны, але ўсё ж такі аркестр), мастацкая галерэя (пастаянная і сезонная вулічная), ну і адна з самых галоўных культурных устаноў (апрача „Хаткі”) — Лясная опера. Нічога што ў лесе, бо Сопат маленькі і відочна не хапіла месца ў горадзе, дык пабудавалі яе ў лесе, яшчэ перад вайной і так ужо засталося. У Сопаце апрача Універсітэта другога веку дзейнічаюць эканамічныя інстытуты Гданьскага універсітэта і іншыя вышэйшыя школы. Жыхары Сопата — дзіўныя людзі. Мала ім дзяржаўных і хрысціянскіх свят, то яшчэ арганізуюць святкаванні ў гонар вуліц, пры якіх жывуць. Прыгадаю толькі пра свята вуліц Каспровіча ці Герояў Вэстэрплятэ. А ў час сёлетняга доўгага уік-энда з 1 да 4 мая святкаваў слаўны ў Супольнай Еўропе Монцяк (вуліца Герояў Монтэ-Касіна, якая вядзе да мола — рэд.) пад лозунгам „Ulica — Sopot Artystów”.

Думаю, што ўсе галоўныя культурныя ўстановы, якія я тут пералічыў, вылучаюць Сопат з ліку іншых гарадоў Польшчы. Але мала таго, замест саромецца за сваё непрафесіянальнае будаўніцтва, Сопат не толькі не выпраставаў сцен „Крывога доміка”, то яшчэ занёс яго, апрача найдаўжэйшага ў Еўропе мола (здымак мола перад сезонам, на першым плане ўнук Міхась), Монцяка (здымак вуліцы ў святочны дзень) і Лясной Оперы, у спіс турыстычных атракцыёнаў горада (глядзі здымак будаўнічай нядбайнасці).

Для мяне, дзеля творчага выцішэння і адпачынку, найбольш адпавядае Сопацкі лес з яго чароўнымі ярамі, горамі і далінамі ды веласіпеднымі сцежкамі.

Уладзімір Някляеў

www.nekliaev.by | афіцыйны сайт

Імя Уладзіміра Някляева добра знаёмае не толькі аматарам літаратуры, але і многім тым, каму папросту падабаюцца ягоныя вершы, проза і песні на яго словы. Апантаны прыхільнік беларушчыны, ён даволі востра ўспрымае тое, што адбываецца ў сённяшняй Беларусі, дзе вельмі рэдка сустрэнеш беларускае слова, а дэмакратыя і правы чалавека — незразумелыя выразы.

Дзякуючы інтэрнэту, сёння мы можам пазнаёміцца з творчасцю Уладзіміра Някляева не выбіраючыся ў бібліятэку ці кнігарню. Для гэтага дастаткова зайсці на ягоны сайт па адрасе http://nekliaev.by. Менавіта тут мы знойдзем не толькі прозу і вершы літаратара, але і газетныя артыкулы і інтэрв’ю, якія раскрываюць ягоныя адносіны да сучаснай беларускай рэчаіснасці.

Выява сайта, выкананая ў бела-блакітных тонах, настройвае на спакойнае азнаямленне з ім. З правага боку месціцца фотаздымак Уладзіміра Някляева, дзе ён з цыгарэтай у руцэ і пераклнутай праз плячо курткай, нібыта спыніўся на імгненне. Большых аздабленняў сайт не мае, затое мае вельмі многа цікавай інфармацыі, з якой, падаецца, варта азнаёміцца, каб больш зразумець як мовіцца — душу паэта — душу Уладзіміра Някляева.

Першая старонка сустракае віртуальнага наведвальніка філасофскімі запісамі. Найбольш цікавым падаецца апошні, дзе літаральна ў некалькіх радках трапна заўважаецца ледзьве не цэлы сэнс чалавечага існавання. „Веданне таго, што мы ніколі не скончымся, не знікнем, даецца нам яшчэ да жыцця, да зямнога лёсу — і яно, тое веданне, на час жыцця забытае ці аднятае, палягае ў аснове нашых фантазій пра неўміручасць душы. Так ёсць, так павінна быць, бо інакш мы не адважыліся б мець тых, пра каго немагчыма, невыносна думаць, што іх не стане — дзяцей і каханых. Так ёсць, бо іначай мы — вар’яты”. У гэтым кароткім расповедзе насамрэч месціцца вялікае асэнсаванне ўсяго бачанага і зразумелага Някляевым. А пабачыў ён нямала. Каб у гэтым упэўніцца, варта зазірнуць на іншыя старонкі сайта.

Рубрыка „Паэзія” змяшчае ў сябе некалькі зборнікаў вершаў літаратара. Цікава, што кожны з іх выдаваўся раз на дзесяцігоддзе пачынаючы ад 70-х гадоў мінулага стагоддзя.

Проза Някляева на сайце прадстаўленая дзвюма кніжкамі — „Вежа”, што выйшла ў свет у 1988 г. і „Лабух” ад 2003 г. Апошні стаў вельмі папулярным ад моманту свайго выдання. Многія, так званыя беларусканямоўныя беларусы, просяць, каб гэты раман быў перакладзены на рускую мову. Аб гэтым можна даведацца на старонцы „Гасцёўня”.

На жаль, не ўсе рубрыкі даступныя для карыстальнікаў. Так, немагчыма пазнаёміцца з тым, што павінны быць на старонцы „Драматургія”, бо яна, як пішуць распрацоўшчыкі сайта, яшчэ не гатова. Тое самае тычыцца і раздзела „Аб праекце”, што вельмі дзіўна, бо сайту, калі зважаць на допісы яго наведвальнікаў, ужо чатыры гады.

Старонка „Песні” таксама не вельмі добра распрацавана. Аднаго пераліку песень, музыка якіх была пакладзена на словы вершаў Някляева, здаецца, замала для таго, каб пазнаць меладычнасць ягоных вершаваных твораў.

Затое рубрыкі „Прэса” і „Публіцыстыка” даюць магчымасць пазнаёміцца з поглядамі пісьменніка, выявіць ягонае стаўленне да падзей у Беларусі. У гэтым сэнсе найбольшую цікавасць выяўляе заява, што была зроблена Някляевым у 1999 годзе ў Варшаве.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

Беларусь,беларусы...

Красавіцкія тэзісы

Крыху запазнена, але падвядзем вынікі красавіка для беларускага спорту. Як зазвычай тэзісна вызначаем лепшых спартоўцаў месяца ў індывідуальных намінацыях. Каляндар красавіка быў не такі насычаны, праводзіліся пераважна адборавыя турніры да пекінскай алімпіяды, але падсумаваць ёсць што.

1. Канстанцін Сіўцоў (веласпорт) упершыню ў гісторыі айчыннага спорту выйграў прафесійную шматдзённую гонку! Беларусу не было роўных у ЗША на вельмі прэстыжным і прэтэнцыёзным „Тур дэ Джорджыя”. Яго пераможцамі дагэтуль былі толькі амерыканцы, а летась славянскі гоншчык.

2. Юрый Раманаў (бокс) правёў бой па абароне свайго чэмпіёнскага тытула сярод прафесіяналаў па версіі EBU ў вагавай катэгорыі да 61 кг. У Лондане беларускі баксёр па мянушцы „Цар” накаўтаваў чэмпіёна Вялікабрытаніі Джонатана Тэкстана (які не прайграваў з 2002 года) і трэці раз адбараніў свой „трон” чэмпіёна Еўропы. Цяпер Раманаў нацэльваецца на сусветны тытул.

3. Рызван Гаджыеў (вольная барацьба) яшчэ паўгода таму здабыў алімпійскую ліцэнзію, стаўшы трэцім у сваёй вагавай катэгорыі (да 55 кг) на чэмпіянаце свету. Зараз на еўрапейскім форуме ў Фінляндыі ён заняў другое месца. **Мурад Гайдараў** у катэгорыі да 74 кг дасягнуў такога ж выніку. Прыкра толькі, што вызначаюцца прывезеныя легіянеры, а ўласна айчынная школа барацьбы не дае моцных атлетаў.

4. Андрэй Казусёнак, Мікалай Баркоўскі (дзюдо). Абодва сталі бронзавымі лаўрэатамі ў Лісабоне на чэмпіянаце Еўропы (катэгорыі да 90 і 81 кг адпаведна).

5. Іосіф Чугашвілі (грэка-рымская барацьба) стаў трэцім у прэстыжнай катэгорыі да 120 кг. Амаль цёзка Сталіна, малады барэц, досыць паспяхова выступае на апошніх турнірах.

1. Вольга Хілько (вольная барацьба) на кантынентальным першынстве, што прайшло ў фінскім Тампэрэ, заваявала сярэбраны медаль у катэгорыі да 63 кг.

2. Алена Леўчанка (баскетбол). Цэнтравая зборнай Беларусі і клуба з Екацярынбурга стала ўладальніцай бронзавага медаля розыгрышу жаночай Еўралігі. Унёсак нашай баскетбалісткі ў поспех расійскага клуба быў досыць важкім.

3. Ганна Бяляева (вольная барацьба) прывезла дамоў з еўрапершынства бронзавую ўзнагароду ў катэгорыі да 67 кг. **Юлія Смычкова** (таэквандо) дасягнула раўназначнага поспеху ў сваім відзе (да 55 кг).

4. Аксана Мянькова (лёгкая атлетыка) на турніры за прызы Яўгена Шукевіча (патрыярху айчыннай каралевы спорту ўжо 93 гады!) вызначылася выдатным вынікам у кіданні молата. 74,68 — другі вынік сезона ў свеце.

5. Іна Жукава (мастацкая гімнастыка) у Партугаліі на этапе Кубка свету ўзяла бронзу ў практыкаванні са стужкай, у Славеніі — бронзу з абручом і нарэшце ў Іспаніі выйграла фінал з абручом.

Камандай месяца можна намінаваць мінскі хакейны „Керамін”, які ўпэўнена заваяваў тытул чэмпіёна краіны. Ну а ў траўні калектывам месяца можа стаць нацыянальная дружына, якая выступае на чэмпіянаце свету па хакеі. У першым матчы нашы хакеісты паказалі добрую гульню, але ўсё ж саступілі Швецыі — 5:6. Падрабязна пра форум, які праходзіць у Канадзе, у наступным выпуску.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Памятныя здымкі

Уладзімір СІДАРУК

У дамашнім альбоме захаваліся здымкі больш пяцідзесяцігадовай даўнасці. Кожная фатаграфія напамінае падзею, якая пакінула след у маёй біяграфіі. Спаглядаю на гэтыя здымкі і намагаюся ажывіць мінулыя будні. Вось памятны здымак з II Ваяводскага з'езда ЗМВ — Саюза вясковай моладзі. Пяцьдзесят гадоў мінае сёлета ад згаданай падзеі, а мне здаецца, што гэта было ўчора. Праўда, не рабіў я калісьці занатовак з падарожжаў, як гэта раблю зараз, у выніку чаго не ўсе прозвішчы сяброў таго часу запамяталіся. Але прыпомню тое, што захавалася ў памяці.

Гайнаўскія дэлегаты (злева на права): NN, Уладзімір Сідарук, Кастусь Ляшчынскі, Ян Шумарскі (за імі ззаду Міхальчук), Міхал Матысюк, Мікалай Младзяноўскі, Грыша Зданоўскі, Анна Сакоўская і Беразавец з Ласінкі

II Ваяводскі з'езд ЗМВ праходзіў у траўні 1958 г. і быў для нас важнай падзеяй. Дэлегаты выбіраліся на павятовых з'ездах з ліку выдатнікаў-актывістаў. У крузе „шчаслівых" і я апынуўся. Гайнаўшчыну рэпрэзентавала група з дзесяці дэлегатаў, узначаленая старшынёю Павятовага праўлення ЗМВ Кастусём Ляшчынскім. З'езд працягваўся два дні і праходзіў у канферэнцзале Ваяводскага камітэта ПАРП у Беластоку. Першага дня дэлегаты знаёміліся з дакладам уступаючага праўлення, пасля чаго пачалася дыскусія. На другі дзень працягвалася дыскусія і выбіраліся ўлады ваяводскага праўлення і дэлегаты на Краёвы з'езд у Варшаву.

Памятаю, што старшынёю Ваяводскага праўлення ЗМВ быў тады Міхал Недзведзь, а намеснікам — Вітальд Мікульскі. Іх пераабралі і на наступны тэрмін паўнамоцтваў. Апрача старшыні Кастуся Ляшчынскага і ніжэйпадпісанага ў з'ездзе ўдзельнічалі сакратар Павятовага праўлення ЗМВ Ян Шумарскі, Міхал Матысюк са Старыны, Мікалай Младзяноўскі з Кляшчэляў, Грыша Зданоўскі з Плянты, Анна Сакоўская з Арэшкава, Беразавец з Ласінкі, Міхальчук з Жукоў і апошняе прозвішча (на здымку першы злева) не запамяталася. У час дыскусіі гаварылася ў асноўным аб культурна-асветнай працы сярод моладзі, засноўванні новых гурткоў, распаўсюдзе чытальніцтва ў вясковым асяроддзі, як і ўдзельніцтве ў грамадскіх пачынах. Харчаваліся мы ў сталовай Ваяводскага камітэта ПАРП, а начавалі ў гасцініцы. Вольны час я праводзіў ў кампаніі Грышы Зданоўскага, Анны Сакоўскай і Беразаўца з Ласінкі (памятны здымак перад камітэтам партыі). З Грышам Зданоўскім мы лічыліся вядучымі актывістамі Павятовага праўлення ЗМВ і часта выязджалі ў камандзіроўкі да вясковых арганізацый. Арганізавалі мы новыя гурткі. Неаднойчы прыходзілася мне гасцяваць у Плянце ў хаце Грышы Зданоўскага. Такіх сяброў як Зданоўскі было ў мяне многа на Гайнаўшчыне. Дзе яны цяпер пражываюць, чым займаюцца? Рады быў бы я кожнай сустрэчы. Затым прыгадваецца мне надпіс на памятным здымку майго пляменніка з Беларусі: „Встречи и расставании это две части, из которых когда-нибудь сложится счастье".

Дэлегаты (злева) Грыша Зданоўскі, Беразавец, Анна Сакоўская і аўтар тэксту перад будынкам ВК ПАРП у Беластоку

Фота з архіва аўтара

Пра назвы

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

У „Ніве" н-р 17 ад 27 красавіка г.г. прачытаў я артыкул Мікіты Дразда пад загалоўкам „У кожнага часу свой твар". Ужо неаднойчы на старонках „Нівы" друкаваліся артыкулы аб патрэбе ўвядзення двухмоўных указальнікаў назваў нашых мясцовасцей. І я аб гэтым пісаў, але ўсе адбіваецца як гарох аб сцяну! На ўсходняй сцяне Беласточчыны ў гмінах войтамі ці бурмістрамі з'яўляюцца пераважна асобы праваслаўнага веравызнання, але ці яны зацікаўлены сваім паходжаннем? Ці яны чытаюць час ад часу „Ніву"? На маю думку, яны цураюцца беларускай мовы. Літоўская і нямецкая меншасці не саромяцца роднага, куды б яны не трапілі.

Я думаю, што нашы актывісты БГКТ, Беларускага Саюза ў РП, тыднёвіка „Ніва", працаўнікі беларускіх перадач радыё і тэлебачання павінны яшчэ больш назаляць войтаў, бурмістраў і гмінных радных наконт увядзення двухмоўных указальнікаў — можа, тады штосьці атрымалася б?! Тут я дам прыклад аб сабе і сваёй гміне. Напісаў я прашэнне на польскай мове ў Гмінную ўправу ў Нарве 5 лістапада 2007 года аб адкліканні мяне з члена вясковай рады і не атрымаў адказу аж да канца сакавіка 2008 г. Зноўку напісаў я прашэнне 26 сакавіка на беларускай мове і падаў яго на рукі войта Нарваўскай гміны Якуба Садоўскага. 27 сакавіка войт даў адказ ды адначасова паведаміў солтысу вёскі, што ў сувязі з гэтым павінен зрабіць солтыс і як яму ў гэтым дапаможа гмінная ўстанова, а мне падзякаваў за добрае супрацоўніцтва. Як відаць, і войт, і працаўнікі гміны ўмеюць чытаць па-беларуску. А як пераканаць іх наконт таго, каб паставілі двухмоўныя ўказальнікі? На гэта ж ёсць грошы ў Міністэрстве ўнутраных спраў і адміністрацыі! Хоціць крыху паклапаціцца. Падумайце аб гэтым спадарства войты Гайнаўскага павета, каб не быць апошнімі войтамі ў краіне, якія ўвядуць двухмоўныя ўказальнікі!

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афрыканскую прыказку.

1. збожжа для каня = 18 _ 6 _ 25 _ 11 _;
2. лёгкая, празрыстая тканіна = 30 _ 24 _ 10 _ 15 _;
3. правы прыток Волгі = 36 _ 1 _ 7 _;
4. светла-карычневы колер з ружова-жоўтым адценнем = 32 _ 34 _ 29 _;
5. алкагольны напітак Ноя = 9 _ 4 _ 26 _ 23 _;
6. травяністая расліна з пахучым лісцем, якая разводзіцца для дэкаратыўных і прамысловых мэтаў (*Geranium*) = 43 _ 42 _ 33 _ 16 _ 17 _ 38 _;
7. да пары ваду носіць = 35 _ 45 _ 31 _ 12 _;
8. зімовы месяц = 3 _ 19 _ 39 _ 46 _;
9. здольнасць гаварыць, якая ў Беларусі дзяржаўная = 27_ 28 _ 40 _ 41 _;
10. спадарожнік у сонечны дзень = 20 _ 8 _ 22 _ 21 _;
11. атрута старажытнагрэчаскага філосафа Сакрата = 37 _ 13 _ 14 _ 44 _ 5 _ 2 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 15 нумара

Львоў, Вінніца, грыва, Гродна, яд, арыя, горад, прарок, кеглі, Яна, доўг, Заблудаў, Кіеў, выпуск, Амур, вайна, Броўка, волава, любоў, „Алеся", Друя.

Рашэнне: **Доўгая дарога выпрабоўвае каня, доўгая разлука выпрабоўвае сяброў.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.
Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,
Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52. **Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BANK PEKAO S.A. O/Białystok 38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 750 egz.



18.05 — 24.05

(22.03. — 20.04.) Не ўключайся да 19.05. у сумніўныя мерапрыемствы. 20.05. можаш пачаць рабіць такое, у чым не разбіраешся; глядзі, каб з-за гэтага не трапіць у фінансавую кабалу! Нявыключана, што расчаруешся кампенсацыяй. Затое на працы можа быць павышэнне.

(21.04. — 21.05.) 20.05. — ідэальны час на распачацце новых дзеянняў, рэалізацыю планаў, змаганне ў абарону ўласных інтарэсаў. Многа сілы і шчасця. Не трапляй у крайнасці з дыетай, хоць не еж абычаго.

(22.05. — 22.06.) Уключышся ў справы, з якімі цяжка справіцца. Старайся рабіць толькі столькі, колькі дасі рады і колькі мусіш. Пазбудзешся з хаты непатрэбных рэчаў, сярод сяброў чыстка неабавязковая — тыя, з кім схочаш парваць, самі перастануць табе званіць.

(23.06. — 23.07.) 20-24.05. паявяцца шанцы, каб штосьці моцна змяніць у жыцці, асабліва ў тым, што табе не падабаецца. Загоіш эмацыянальныя раны, забудзешся на праблемы. З 22.05. (да 26.05) пазбягай падарожжаў; спадзявайся таксама змены ў фінансавых планах.

(24.07. — 23.08.) Калі партнёр схоча штосьці перад табой схаваць, не прытварайся, што аб нічым не ведаеш! Прымушаючы кагосьці да змены пазіцыі, можаш страціць ягоную сімпатыю. Ільвоў з 16-20.08. можа хтосьці ашукаць. 20.05. асабліва трымай язык за зубамі!

(24.08. — 23.09.) У каханні будзь непасрэднай — тады ўсё пойдзе ў лепшы бок. Старайся паафармляць найважнейшыя справы. У канцы тыдня вельмі добры час прымаць гасцей. Можаш тады таксама пачаць ачышчальную галадоўку.

(24.09. — 23.10.) Да 20.05. усё табе ўдаецца. З 24.05. цяжка будзе табе разумецца з жанчынамі, але пачнуцца вельмі плённыя і карысныя знаёмствы. Ты аўтар усіх прафесійных змен. Можаш пачаць доўгі праект — работы будзе шмат, але поспех мураваны.

(24.10. — 22.11.) Шмат прафесійных поспехаў. Асабліва ўдалыя падарожжы і плённыя кантакты з людзьмі; дзякуючы ім адкрыюцца перад табою незвычайныя перспектывы. 20.05. будзеш раздражнены, празмерна ўражлівы, злосны, магчымыя кампанейскія згрызоты — не прымай усяго ў сэрца, бо ж не варта!

(23.11. — 22.12.) Да 20.05. ты проста купаешся ў шчасці! Добры час пазнаёміцца з прапановамі курсаў на павышэнне кваліфікацыі, выбару школы. Зайдзі да касметолага ці цырульніка — вынік паваліць з ног усіх гледачоў!

(23.12. — 20.01.) Будзеш добра сарганізаваны, нянудны, адносна працавіты. Дома ўстаў дадатковыя замкі ў дзвярах. Хоць добра паказваюцца фінансы. Рызыка нястрашная — дзякуючы ёй дасягнеш найбольш!

(21.01. — 19.02.) Да 20.05. ты асабліва спраўна паводзіш сябе ў кампаніі большай і больш інтымнай. 20.05. дапякуць табе моцна мухі ў носе шэфа. З 22.05. твая прага свабоды можа быць у вялікай апазіцыі да празмернай апякунчасці партнёра — нялёгка будзе вам вытрымаць разам!

(20.02. — 21.03.) Магчымыя неспадзяванкі. Вельмі мілыя кампанейскія сюрпрызы. Можаш паперастаўляць мэблю, купіць тэлевізар, урэшце скапаць агародчык. Зграбна спалучыш ашчаднасць са шчодрасцю.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960